Дзень Волі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Аляксандр Баршчэўскі ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 14 (2708) Год LIII | Беласток, 6 красавіка 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Свята Волі як Новы год

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Акт 25 Сакавіка 1918 года, які абвясціў Беларускую Народную Рэспубліку, — як трапна адзначыла старшыня Рады БНР на выгнанні Івонка Сурвіла, — найважнейшая падзея ў навейшай гісторыі Беларусі. Таму зразумела што 90-я ўгодкі БНР, якія беларусы адзначаюць цягам 2008 года, не маглі прайсці звычайна, без глыбейшага асэнсавання ідэі. Добры прыклад і зарад энергіі далі нам беларусы Літвы, якія ўжо са студзеня г.г праводзяць у Вільні патрыятычня мерапрыемствы. Беласток не мог быць горшым. У арганізацыю святкавання ўключыліся Беларускі саюз у РП, Беларускае аб'яднанне студэнтаў, рэдакцыя „Нівы", Асветнае таварыства АББА, Беларускае гістарычнае таварыства. Традыцыйна не падвялі гайнаўскія ліцэісты і беластоцкія навучэны беларускай мовы, настаўнікі ды беларускія літаратары. Сродкі на святкаванне ахвяравалі самі арганізатары і ўдзельнікі, кожны хто колькі змог дакінуў са сваёй кішэні на кветкі ці неабходныя аплаты. Сёлета 25 Сакавіка выпала ў трэці дзень каталіцкага Вялікадня. Магчыма, і гэтая акалічнасць паспрыяла арганізатарам, бо многія ўдзельнікі святкавання проста скарысталі з выхадных. Ужо пры ўваходзе ў кавярню „Фама" сустрэла мяне доўгая чарга да распраналкі. У шэсць гадзін вечара, калі пачыналася святкаванне, зала была запоўнена (усе 140 месцаў). Сярод грамады пераважала моладзь і публіка сярэдняга ўзросту. Паўсюдна адчувалася святочна-сяброўскую атмасферу, спантанныя ўрачыстыя моманты. Вось група дзяцей з „чацвёркі" абкружыла паэта Віктара Шведа і праспявала яму з нагоды дня нараджэння „Многае лета" ды ўручыла вялізны букет кветак. Не падвялі запрошаныя госці, сярод якіх з'явіліся парламентарый Роберт Тышкевіч, сенатар Багдан Пашкоўкі, намеснік прэзідэнта горада Беластока Аляксандр Сасна, намеснік старшыні Гарадской рады г. Беластока Марк Масальскі, дырэктар Дэпартамента культуры Маршалкоўскай управы Анатоль Вап ды беларускія літаратары: Сакрат Яновіч, Георгій Валкавыцкі, Надзея Артымовіч, Віктар Швед, Юры Гумянюк, Міра Лукша...

Мерапрыемства са знаўствам павёў журналіст Радыё Беласток Яраслаў Іванюк.

Згодна традыцыі, святкаванне пачалося з гімна „Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Другім пастаянным элементам было зачытанне віншавальнага ліста-звароту да беларускага народа старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы (чытайце ў папярэднім нумары „Нівы").

Навейшая гісторыя афіцыйнага святкавання ўгодкаў БНР у Польшчы пачынаецца з 1989 года. Як першыя бел-чырвона-белы сцяг і герб Пагоню ў дзень 25 Сакавіка ўшанавалі студэнты БАС. З гэтай пары святкаванне адзначаецца непарыўна. Спачатку ў вузкім сяброўска-сямейным крузе, зараз з удзелам шырокай грамады беларускай інтэлігенцыі, моладзі, а таксама афіцыйных гасцей. Калі меркаваць па колькасці публікі, якая прыходзіць адзначыць Дзень Волі, можна сказаць, што цяпер пабольшылася яна ў дзесяць разоў. Але справа не ў колькасці. Разам з адраджэннем сімвалаў з'явіліся беларускія арганізацыі, увялася ў працэс навучання беларуская мова (ад прадшколля па універсітэт), дзейнічаюць беларускія СМІ і галоўнае, не загінула нацыянальная свядомасць беларусаў. Невыпадкова сярод узнагароджаных сімвалічным букетам бел-чырвона-белых кветак сёлета быў гісторык Юры Туронак з Варшавы (на жаль, па прычыне здароўя ён не мог прыехаць). Часта пакаленне першага БАСу называюць пакаленнем гісторыкаў. У гэтай справе садзейнічаў якраз Юры Туронак, які сваёй пасіяй, заангажаваннем і адвагай натхняў маладых да пошукаў гістарычнай праўды. Статыстычны беларус наогул не ўяўляе, якая ў яго гістарычная спадчына, якую заангажаванасць і моц праявілі нашы землякі ў стварэнні БНР. На гэтае пытанне паспрабаваў адказаць у сваім дакладзе гісторык Алег Латышонак (мы надрукавалі яго ў папярэднім нумары „Нівы"). Варта ў гэтым месцы прыгадаць яшчэ раз прозвішчы суродзічаў, якія 90 гадоў таму змагаліся за Беларусь. Гэта Яўген Хлябцэвіч з Кленік, Язэп Варонка з Сакольшчыны, Усевалад Ігнатоўскі з Такароў, Іван Краскоўскі з Дубіч-Царкоўных, Аляксандр Грыкоўскі з Корніна, Яраслаў Кастыцэвіч з Бельска, Мікола Дзямідаў з Гарадка. Апошні павёў за сабой у бой за незалежную Беларусь чатырыста добрахвотнікаў з наваколля Беластока...

Георгію Валкавыцкаму (справа) у сакавіку гэтага года споўнілася 85 гадоў

Бел-чырвона-белым букетам былі абдараваныя таксама мастак Лявон Тарасэвіч (які якраз паехаў у Італію на адкрыццё выстаўкі) і Георгій Валкавыцкі, дзякуючы якому беларускае роднае слова ў сакавіку 1956 года трапіла пад сялянскія стрэхі ў выглядзе тыднёвіка беларусаў у Польшчы „Ніва". Гэта ён на працягу трыццаці аднаго года як галоўны рэдактар вучыў пісаць, рэдагаваць, любіць і апісваць беларускае не толькі на роднай Беласточыне. У 1958 годзе захацелася яму выйсці з беларускім літаратурным словам з Беласточчыны з-пад стрэх і патрапіць на культурныя салоны Польшчы, Беларусі, Еўропы, спрычыніўшыся да ўзнікнення Літаратурнага аб'яднання „Белавежа".

У кантэкст святкавання дасканала ўпісаўся паэтыча-музычна-фатаграфічны мантаж на вершы Ларысы Геніюш ды музыку Яна Тарасевіча і мультымедыйны паказ сямейных здымкаў і лістоў з жыцця і творчасці Л. Геніюш. Пастаноўку, якая выклікала шчырае захапленне і дала моцны зарад энергіі, падрыхтавала настаўніца Аліна Ваўранюк са сваімі вучнямі. На сцэне выступіла таксама Ілона Карпюк з патрыятычна-лірычнымі песнямі і дзявочы калектыў „Знічка" з гайнаўскага белліцэя. На канец можна было паглядзець фільм пад красамоўным загалоўкам „Дзень Волі", які паставіў пісьменнік Уладзімір Арлоў у супрацоўніцтве з Юры Хашчавацкім і Алегам Дашкевічам.

Святкаванне працягвалася ў сяброўскіх кругах у кавярнях горада ды прыватных дамах. У кругах беларускай інтэлігенцыі Свята Волі ўспрымаецца амаль як Новы год. З самога рання людзі высылаюць сабе эсэмэскі і мэйлы, аздабляюць дамы сцягамі, часам гасцююць да рання ў сяброўскіх кампаніях.

Антыгандзізм ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Але вернемся на Беларусь. Ва ўдзельнікаў мірнай акцыі 25 сакавіка 2008 года, прысвечанай найвялікшаму нацыянальнаму святу, Дню Волі, не было ні палак, ні якой іншай зброі. Перад пачаткам мірнага мінскага шэсця Гандзі быў бы перакананы, што ніхто з яго ўдзельнікаў не будзе ні пабіты, ні арыштаваны...

90-я ўгодкі БНР у Гданьску і Сопаце ☞ 4

МК

Дзень Волі пад акупацыяй ☞ 12

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Угодкі БНР у Вільні ☞ III

Алесь АДАМКОВІЧ

ЗАПРАШЭННЕ

Белавежскі асяродак культуры і Цэнтр прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка" запрашаюць 5 і 6 красавіка

*ў Белавежу і Гайнаўку на святкаванні **„Года Неверліх"** — славутых польскіх пісьменнікаў звязаных паходжаннем менавіта з Белавежай.*

Пачатак у суботу 5 красавіка а 10-й гадзіне ў Белавежскім асяродку культуры. У 11 гадзін паніхіда пры магіле бацькі Ігара Неверлі, затым літаратурны сімпозіум, а ў 18 гадзін у кіно паказ фільма А. Цітковa „Z uczty Bogów.". У нядзелю 6 красавіка а 17 сустрэча з Яраславам Абрамавым-Неверлі ў Цэнтры прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка" ў Гайнаўцы.

9 770546 196000

Антыгандзізм

Калісьці Гандзі — вялікі індыйскі змагар і мысліцель, стваральнік тэорыі несупраціўлення гвалту гвалтам — заўважыў, што яго тэорыя яшчэ далёкая ад дасканаласці і што ў будучым яго паслядоўнікі змогуць раскрываць усё новыя і новыя мажлівасці негвалтоўнага змагання за свае ідэалы і перамогі, бо супраціўнік нічога не можа зрабіць з тым, хто без зброі і нават без сціснутых кулакоў выйшаў пратэставаць супраць несправядлівасці.

Сапраўды, дзейнасць індыйцаў тады прынесла перамогу. Англічане нічога не змаглі прыдумаць і былі вымушаны прызнаць незалежнасць Індыі. Не будзеш жа біць людзей, якія нават рук не падымаюць дзеля сваёй абароны. Бо за што іх біць? Кожны мае права хадзіць на плошчу і выказваць сваю думку. І калі гэты чалавек без палкі, то і на яго ніхто палку не падыме.

Так думалі не толькі англічане ды індыйцы. Гандзізм як рух расквітнеў па ўсім свеце і практычна паўсюдна прынёс поспехі. Паслядоўнікі Гандзі нічога новага ў гэтую тэорыю збольшага не дабавілі, бо сама ягоная ідэалогія аказалася настолькі дзейснай і дасканалай, што яе ворагі нічога не змаглі супрацьпаставіць ёй, незалежна ад таго, у якім кутку планеты і які народ браў яе за сваю асноўную зброю.

Але вернемся на Беларусь. Ва ўдзельнікаў мірнай акцыі 25 сакавіка 2008 года, прысвечанай найвялікшаму нацыянальнаму святу, Дню Волі, не было ні палак, ні якой іншай зброі. Перад пачаткам мірнага мінскага шэсця Гандзі быў бы перакананы, што ніхто з яго ўдзельнікаў не будзе ні пабіты, ні арыштаваны. Нават англійскія салдаты, — падумаў бы ён, — акупанты і адкрытыя ворагі, якія сілай зброі захапілі Індыю і былі акупантамі ды каланізатарамі, узброенымі прадстаўнікамі чужой краіны ды іншай расы, прадуктам іншай культуры і якія сапраўды маглі нешта не разумець у індыйскім нацыянальна-вызвольным руху, скіраваным супраць іх з мэтай выгнання англічан з паўвострава Індастан, не паднялі б руку на мірных людзей. Тым больш тут, на Беларусі, дзе з другога боку ад удзельнікаў мітынгу стаяць такія ж самыя беларусы, такія ж самыя людзі, якія ходзяць па адных і тых жа вуліцах, вучыліся ў адных і тых жа школах і дыхаюць адным і тым жа паветрам.

Толькі ўсё пайшло чамусьці не так. Увесь цывілізаваны свет жахнуўся такому нічым не абгрунтаванаму і неапраўданаму жорсткаму разгону мірнай акцыі. Сотня затрыманых, сярод якіх збітыя ў горкі яблык маладыя людзі. Дзесяткі звярнуліся ў шпіталі за медыцынскай дапамогай. І лупілі іх не салдаты іншаземнай дзяржавы.

Не паспелі сціхнуць пратэсты еўрапейскіх краін ды Злучаных Штатаў Амерыкі супраць такіх жорсткіх дзеянняў беларускай улады, як па ўсёй Беларусі пачалася беспрэцэдэнтная па сваіх маштабах акцыя сілавых ведамстваў. Тыя структуры, якія павінны абараняць ды ахоўваць жыццё і маёмасць сваіх суайчыннікаў, сталі ламацца ў офісы ды кватэры незалежных журналістаў, апазіцыйных палітычных партый і нават грамадскіх арганізацый і масава выносіць адтуль камп'ютэрную ды іншую прафесійную тэхніку. І ўсё гэта бессаромна робіцца на вачах усяго свету.

Адкуль жа такая жорсткасць да сваіх суайчыннікаў і абыякавасць да лёсу сваёй краіны? Чаму беларускія сілавыя структуры абыходзяцца са сваімі суайчыннікамі горш, чым акупанты ды каланізатары? Чаму беларуская ўлада пайшла на такі крок? Гэтыя пытанні задае зараз кожны беларус, які клапоціцца пра будучыню свайго народа. На тое павінны былі быць вельмі важкія прычыны, бо нікому не да спадобы такі міжнародны рэзананс і ўзмацненне эканамічных санкцый. Але беларуская ўлада нібыта не заўважае гэтага. Ці не хоча заўважаць.

А прычына такіх дзеянняў па ўсім відаць ёсць. Занадта агрэсіўна вытураюцца амерыканскія амбасадары ды разганяецца палітычная апазіцыя, каб на тое не было важкай прычыны. Хутка мы пра тую прычыну даведаемся. І перакананы, што тут, як і раней, не абышлося без пуцінскай Расіі, бо менавіта там, за семдзесят гадоў савецкай улады, добра вывучылі і адшліфавалі майстэрства змагання з гандзізмам.

Віктар САЗОНАЎ

Вытрывалі і будзем жыць

90 год таму назад у апошнім годзе першай сусветнай вайны стала відавочным, што тадышнім еўрапейскім імперыям — Расіі, Аўстрыі, Прусіі — прыходзяць канцы. Турмы народаў пачалі не толькі трашчаць, але і лопаць. Тады сярод эліт нашага народа выспявалі ўжо думкі не толькі пра беларускую аўтаномію, але і незалежнасць. Абвешчаная Актам 25 Сакавіка 1918 г. Беларуская Народная Рэспубліка назаўсёды ўпісалася не толькі ў беларускую нацыянальна-гістарычную свядомасць, але вынесла беларускае пытанне на міжнароднае палітычнае абмеркаванне. На жаль, тады яшчэ без належнага выніку. Хаця і зараз некаторыя міжнародныя сілы стараюцца праігнараваць пытанне самастойнасці беларускай дзяржаўнасці, зыходзячы толькі са сваіх палітычна-эканамічных рахункаў, то ў даўжэйшай перспектыве немагчыма перакрыць права на свабоду амаль дзесяцімільённаму народу, расселенаму ў цэнтры Еўропы. Таму менавіта 25 сакавіка мы, беларусы ў Польшчы, выказваем не толькі сваю пашану для нашай мінуўшчыны, але ў гэты момант яднаемся з мільёнамі тых беларусаў, якія прагнуць лепшай долі і будучыні для нашай духоўнай Бацькаўшчыны. Ушаноўваем таксама памяць нацыянальных герояў і звычайных штодзённых барацьбітоў за беларускую справу, якія адышлі з гэтага жыцця ў кожным куточку свету.

Нам, беларусам Беласточчыны, на працягу апошніх дзевяноста гадоў прыйшлося вытрымаць не толькі гістарычныя буры, але і злабадзённыя клопаты, звязаныя з элементарным выжываннем, вельмі часта коштам нацыянальнай ідэнтыфікацыі і культурнай, беларускай пераемнасці. Аднак, нягледзячы на прыгнёт і знішчэнне, беларуская справа тут, на Беласточчыне, таксама працягвалася, а нашы дзяды і прадзеды расплачваліся за яе часта найбольшай ахвярай — жыццём. На нас, старэйшых і маладых пакаленнях, ляжыць звычайны нацыянальны абавязак — захаваць беларускасць. Сёння можна гэта праявіць, адстойваючы свабодна свае справы ў самаўрадавай, гаспадарчай, культурна-асветнай дзейнасці. І крыху сумна ды балюча робіцца на сэрцы, калі бачым як частка нашай меншасці, маючы рэальны уплыў на мясцовую ўладу, не карыстаецца належнымі нам, нацыянальнай меншасці, законамі, але наадварот—спешліва адрачецца ад выразнай беларускай тоеснасці. Ніхто за нас не ўвядзе ў жыццё магчымасці карыстацца двухмоўнымі назвамі і беларускай дапаможнай мовай у публічным жыцці беларускіх вёсак і мястэчак Беласточчыны. Ніхто за нас не будзе пасылаць дзетак на ўрокі беларускай мовы, на якіх можна будзе таксама даведацца і пра Акт 25 Сакавіка. Ніхто за нас не будзе выпісваць і чытаць нашы выданні. Калі гэтага не будзем рабіць, то пакарае нас гісторыя і зробім з сябе пасмешышча перад продкамі і суседзямі.

У нас, беларусаў у Польшчы, ёсць свая гістарычна-культурна-асветная традыцыя. У гэтым годзе адзначаем юбілей 50-годдзя Літаратурнага аб'яднання „Белавежа", дзякуючы якому мы, беларусы Беласточчыны, назаўсёды ўпісаліся не толькі ў беларускі, але і сусветны, культурны кантэкст. Дзякуем ім за ўсё і жадаем вытрымкі ў нялёгкі для літаратуры час. Менавіта 20 гадоў таму ў час святкавання 70-х угодкаў БНР 26 сакавіка 1988 г. узнік легальны заснавальніцкі камітэт Беларускага аб'яднання студэнтаў, якое, між іншым, вярнула сабе і нашаму грамадству памяць пра бел-чырвона-белы сцяг і герб Пагоню. Яго сябры выносяць і падтрымоўваюць многія ініцыятывы беларусаў Падляшша. Былым, сённяшнім і будучым басаўцам жадаю здзяйснення найбольш летуценных думак. Можам і павінны мы пахваліцца нашай беларускай, гістарычнай школай у Польшчы, якая расследуе і развейвае розныя міжнацыянальныя міфы. Дзякую ўсім настаўнікам, школам, медыям і грамадскім арганізацыям, якіх праца ў карысць беларускасці для чарговых пакаленняў, хаця часта не з'яўляецца відавочнай штодзень, прыносіць плады ў будучым.

Святкаванне Акту 25 Сакавіка арганізуецца таксама дзеля беларускай будучыні. І аніякія перашкоды кшталту насмешкі над беларускімі гістарычнымі сімваламі, візавыя клопаты з паездкамі ў духоўную Бацькаўшчыну, фінансавыя і арганізацыйныя нашы слабасці не ў змозе зламаць адвечную прагу кожнага народа быць роўным сярод роўных, быць свабодным паміж свабодных. Дзеля гэтага паўсюдна гучыць кліч „Жыве Беларусь!". І яна будзе жыць.

Яўген ВАПА

Вачыма еўрапейца

Бяссілле і страх

Як сцвярджаюць псіхолагі і сацыёлагі, агрэсія вельмі часта з'яўляецца вынікам бяссілля і страху. На маю думку, без сумнення так было ў час святкавання 90 гадавіны абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і два дні пазней, калі ў Мінску і іншых гарадах Беларусі абшуквалі офісы і кватэры журналістаў, галоўным чынам спадарожнікавага тэлебачання БелСат, але і таксама м.інш. Радыё Рацыя і Еўрапейскага Радыё для Беларусі.

Абсалютна беспрэцэдэнтныя праявы бяссілля і страху Аляксандра Лукашэнкі пачаліся з самага ранку два дні пасля 25 сакавіка. КДБ і міліцыя канфіскавалі абсталяванне, пры дапамозе якога незалежныя журналісты перадавалі інфармацыю на Захад, таксама інтэрнэтным шляхам з пацыфікацыі маніфестацыі ў Мінску ў Дзень Волі. Паводле розных інфармацый, былі затрыманы і дапытваны пад дваццаць працаўнікоў незалежных СМІ. Аказалася, што быццам яны зняважылі прэзідэнта Лукашэнку. Працуючы ў Варшаве Аляксей Дзікавіцкі з БелСата так вось тлумачыў 27 сакавіка раніцай:

— Я лічу, што гэта звязана з тым, што 25 сакавіка, калі для большасці СМІ была закрыта магчымасць перадачы праз спадарожнік справаздачы з дэманстрацыі, БелСат быў адзіным, які паказаў матэрыял у эфіры і перадаў яго іншым калегам.

Амаль паралельна Жана Літвіна, кіраўнік незалежнай Асацыяцыі беларускіх журналістаў адназначна заявіла:

— Гэта адкрытая вайна са свабодай слова.

У такім самым тоне гучалі словы Лявона Баршчэўскага — лідэра Беларускага народнага фронту:

— Аляксандр Лукашэнка аб'явіў сапраўдную вайну супраць незалежнай журналістыкі і элементарных прынцыпаў дэмакратыі.

Падтрымалі дух неадкладныя рэакцыі польскіх палітыкаў, між іншым еўрадэпутата Яцка Пратасевіча, старшыні групы па справах Беларусі Еўрапарламента. Калі ў Беларусі працягваліся вобыскі і допыты, сам прэзідэнт Лех Качынскі выказаў глыбокую трывогу:

— Тое, што зараз адбываецца ў Беларусі, з'яўляецца нават не вяртаннем у ранейшую сітуацыю, а яшчэ яе пагоршаннем. Выклікае гэта яшчэ большую сусветную трывогу.

Хвіліну пасля ў Сейме супольную прэс-канферэнцыю сарганізавалі дэпутаты Роберт Тышкевіч (старшыня ГП на Падляшшы, старшыня парламенцкай групы па справах Беларусі), Адам Ліпінскі (ПіС) і Яцак Пратасевіч. Дэпутат Тышкевіч:

— Асабліва істотным будзе цяпер узмацненне стыпендыйнай праграмы для беларускай моладзі, бо асабліва яна ў Беларусі становіцца ахвярай рэпрэсій. Апошняя хваля рэпрэсій з'яўляецца сур'ёзным крокам назад на шляху выхаду Беларусі з міжнароднай ізаляцыі.

Адам Ліпінскі:

— Мусім выказаць адназначную і салідарную пазіцыю ўсяго парламента.

Я з увагай сачыў за гэтымі рэакцыямі і запалі мне ў памяць словы Яна Ракіты:

— Там, дзе маем дачыненне з палітычным тэрорам, канчаецца час палітыкі, а пачынаецца час прынцыпаў.

Нельга ўжо быць шызафрэнічнай сітуацыі, якую так абагуліў зараз пасля падзей 25 сакавіка палітычны аналітык Аляксандр Класкоўскі:

— З аднаго боку, Еўропа сапраўды трымаецца болей мяккай лініі, бо мацней, як Штаты, знітаваная з Беларуссю. З іншага боку, ісці на нейкае збліжэнне з афіцыйным Мінскам Бруселю таксама не выпадае.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Дзень Незалежнасці ў нашых школах

Белліцэісты класа I „ц” з Гайнаўкі выступілі з патрыятычнай праграмай

Святочныя плакаты ў бельскім ліцэі

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Святкаванне 90-х угодкаў абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі ў Бельскім і Гайнаўскім белліцэях адбылося вельмі ўрачыста, але па-рознаму. У Гайнаўцы была гэта лінейка з патрыятычнымі песнямі, вершамі і расказам пра падзеі 1918 года, сустрэча з беларускім гісторыкам і фільм. У Бельскім белліцэі вядучае месца занялі гульні і спаборніцтвы з патрыятычным ухілам і прэзентацыя нацыянальных страў. Настаўнікі беларускай мовы з іншых школ Бельшчыны, Гайнаўшчыны і Беластока таксама не забываюць пра сакавіцкія падзеі 1918 года і знаёмяць з імі вучняў на занятках роднай мовы.

У гэтым годзе святкаванне Дня Волі якраз выпала ў вольны ад вучобы дзень (велікодны перапынак) і таму адзначаўся ён пазней, з 26 па 29 сакавіка, а ў Бельскім белліцэі частка святкаванняў адтэрмінаваная на красавік. У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы традыцыйна, яшчэ да святкаванняў на калідоры паявілася адмысловая насценгазета з беларускімі нацыянальнымі сімваламі. Святочнае спатканне адбылося 26 сакавіка ў актавай зале, аздобленай двума гербамі Пагоня і вялікім лозунгам у бел-чырвона-белых колерах. Перад залай таксама красаваліся беларускія нацыянальныя сімвалы.

— Хаця ўчора быў вольны ад навукі дзень (25 сакавіка), вучні класа I „ц”, якія наладзілі сустрэчу, прыйшлі і падрыхтавалі сцэнаграфію. Мы таксама правялі апошнія рэпетыцыі, а з часткай ліцэістаў я ездзіла ў Беласток на тамашнія святкаванні, — сказала апякунка моладзі, настаўніца беларускай мовы Вольга Сянкевіч.

У час урачыстай лінейкі моладзь прадставіла слоўна-музычны мантаж. Белліцэісты выступілі з патрыятычнымі вершамі Янкі Купалы, Максіма Багдановіча і Уладзіміра Караткевіча, якія перапляталіся гістарычнымі звесткамі пра 1918 год і беларускімі песнямі ў выкананні першакласнікаў. Спецыяльна на школьнае мерапрыемства новы рэпертуар падрыхтавала „Знічка”. Песні „Малітва”, „Сцяг” і „У гушчарах” увялі ва ўзнёслы настрой.

— Мы звярталі ўвагу, каб змест слоўна-музычнага мантажу быў адпаведны да святкаванняў. Паколькі вучні класа I „ц” расспяваныя, мы рашыліся таксама самі заспяваць, — кажа настаўніца Вольга Сянкевіч, якая падрыхтавала сцэнарый да спаткання і кіравала падрыхтоўкай вучняў да выступлення.

Белліцэісты ў час размовы праявілі эмацыянальны падыход да святкавання ўгодкаў абвяшчэння БНР.

— Я беларуска і для мяне Дзень Незалежнасці з'яўляецца вялікім святам. Лічу, што мы павінны адзначаць яго, як і іншыя беларусы, — заяўляе белліцэістка Наталля Рушук.

— Я таксама лічу сябе беларускай і Дзень Волі для мяне таксама вялікае свята, — гаворыць Жанэта Лукашук, сяброўка Наталлі.

— Трэба святкаваць 25 Сакавіка, каб памятаць аб сваёй гісторыі, — былі згодны Наталля і Жанэта.

— 25 Сакавіка злучае нас з усім беларускім народам і напамінае таксама, што вучымся ў белліцэі, — кажа Іаанна Дамброўская, якая за навукай прыехала ажно з Міхалова.

Сустрэчу з доктарам Алегам Латышонкам з Універсітэта ў Беластоку і прэзентацыю фільма „Плошча” наладзіў Клуб беларуска-польскіх спраў, якім апякуецца настаўнік гісторыі Яўген Янчук. Гісторык Алег Латышонак выступіў з дакладам пра Станіслава Булак-Балаховіча, які змагаўся за незалежную Беларусь пасля абвяшчэння БНР (у гэтым годзе адзначаем 125 гадавіну з дня яго нараджэння). Алег Латышонак расказваў таксама аб падзеях 1918 года, якія давялі да стварэння суверэннай дзяржавы. На ўроках беларускай мовы і гісторыі з падзеямі 90-гадовай даўнасці знаёміліся таксама белгімназісты.

Наведаўшы 28 сакавіка Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім, убачыў я на ніжнім калідоры плакаты з Пагоняй і бел-чырвона-белым сцягам. Каляровыя плакаты і бел-чырвона-белыя сцягі, што віселі побач польскага і еўрасаюзнага, красаваліся таксама ў гімнастычнай зале. Адбыліся там гульні з патрыятычным ухілам і спартыўныя спаборніцтвы першакласнікаў. Усе яны прымеркаваныя былі да Дня Волі, аб якім белліцэісты гаварылі раней на занятках беларускай мовы і гісторыі. Вучні розных класаў спявалі перад камісіяй свой школьны гімн „Люблю наш край”, стараліся як найцікавей зрабіць рэкламу свайму класу, танцавалі польку, выступалі з інсцэніроўкамі казак і адказвалі на пытанні ў турніры ведаў аб Беларусі. Яшчэ да школьных святкаванняў белліцэісты выконвалі плакаты на тэму „Беларусь у маіх вачах”, на якіх паявіліся, між іншым, нацыянальныя бел-чырвона-белыя колеры і лозунг прымеркаваны да Дня Незалежнасці. У час спартыўных спаборніцтваў вучні праявілі сваю лоўкасць, між іншым, у кідках баскетбольным мячом і бегу з бар'ерамі. Аказалася, што ў агульным падліку перамаглі вучні класаў I „а” і I „ц”.

— Безумоўна, варта адзначаць 25 Сакавіка, бо гэта ж абвяшчэнне незалежнасці Беларусі і Дзень Волі. Атрымалася добрая формула, калі мы спалучылі гульні з гістарычнымі інфармацыямі, — кажуць першакласніцы Ганна Мордань і Малгажата Іванюк.

— Нашы святкаванні гэта вельмі добрая нагода, каб замацоўваць нацыянальную свядомасць ліцэістаў. Трэба, каб яны ведалі, што з'яўляюцца не толькі тутэйшымі, але і беларусамі. Гульні і спаборніцтвы больш успрымальныя для маладых людзей, а нашы вучні гэта наша будучыня, — гаворыць член конкурснай камісіі, якая ацэньвала спаборніцтвы, настаўніца Аліцыя Нідэ.

Вучні другіх класаў з раніцы рыхтаваліся да прэзентацыі мясцовых страў Бельшчыны, вядомых іх бабулям і мамам. Некаторыя стравы рыхтавалі самі вучні на дзень або два да святкаванняў, а іншыя — бацькі з дапамогай вучняў. За ўпрыгожанне сталоў галоўнымі адказнымі былі ўжо вучні, якія ад бабуль прывезлі старадаўнія абрусы, макаткі і вышываныя ручнікі. Былі таксама іконы і свечкі, так як у мінулым. Дзяўчаты, якія прэзентавалі стравы і частавалі імі, былі апрануты ў народную вопратку. На сталах паасобных другіх класаў было многа посных страў, паколькі святкаванні праходзілі ў перыяд Вялікага посту. Побач аладкаў, грыбоў, агуркоў, ці пампушкаў, можна было таксама знайсці бульбяную кішку, варэнікі з капустай ці галушкі, якія ў час посту рыхтавалі нашы продкі. Свойскі пірог ці хлеб падыходзілі таксама і да няпосных страў — каўбасы і іншых мясных вырабаў, якія можна было ўбачыць на велікодных сталах бельскіх каталікоў, што апошнім часам штораз часцей выбіраюць навуку ў бельскім белліцэі.

— Усе ліцэісты вельмі добра падрыхтаваліся да прэзентацыі нацыянальных страў. Беларуская музыка, нацыянальная вопратка і ўпрыгожаныя сталы стваралі непаўторную атмасферу. Таму мы і рашыліся ўсім класам прызначыць першыя месцы, — гавораць члены камісіі Уладзімір Вавульскі і Анна Бжазоўская.

Згодна традыцыі апошніх гадоў вучні трэціх класаў у святочны дзень сустракаюцца з беларускімі журналістамі, пісьменнікамі ці гісторыкамі. У гэтым годзе святочныя спатканні адтэрмінаваны на красавік. Затое для вучняў трэціх класаў адбылася прэзентацыя тэлепастаноўкі „Тутэйшыя”.

Таксама традыцыяй стала святкаванне Дня Незалежнасці ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску, дзе вучні знаёмяцца з гісторыяй БНР на ўроках беларускай мовы, а дзеткі і моладзь з выбраных класаў прымаюць удзел ва ўрачыстай лінейцы. У гэтым годзе 29 сакавіка пад кірункам настаўніцы беларускай мовы Міраславы Маркевіч і настаўніка гісторыі Пятра Астасевіча вучні класа VI „д” дэкламавалі вершы і расказалі аб падзеях 90-гадовай даўнасці і нацыянальных беларускіх сімвалах — гербе Пагоні і бел-чырвона-белым сцягу.

— Вучняў падставовай школы агульна знаёмлю на занятках з падзеямі 1918 года, а з гімназістамі дакладней гавару аб абвяшчэнні незалежнасці БНР, — заявіла настаўніца бельскай „тройкі” Валянціна Бабулевіч. — Сёлета ў рамках прапагандавання ідэі незалежнасці Беларусі я на спатканне з вучнямі запрасіла журналістку „Нівы” Ілону Карпюк, а ў планах размова на гістарычныя тэмы з гісторыкамі Алегам Латышонкам і Ленай Глагоўскай.

Іншыя настаўнікі беларускай мовы з „тройкі” на сваіх занятках таксама гавораць пра сакавіцкія падзеі. Пры нагодзе нядаўніх ваяводскіх элімінацый Прадметнага конкурсу па беларускай мове ад настаўнікаў з іншых школ я даведаўся, што на ўроках беларускай мовы яны гімназістам таксама расказваюць пра абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.

Гайнаўка

Патрэбны тратуар па вуліцы Кнеўскага

У 2005-2007 гадах у Гайнаўцы шмат гарадскіх вуліц атрымала асфальтавыя маставыя, м.інш. вул. Баторыя, вул. Доўгая, вул. Электрычная, вул. Саланевіч, вул. Саламяная, вул. Жабя, вул. Кнеўскага, вул. Мілкоўскага, вул. Ракавецкага і вул. Лебядзіная.

На некаторыя з гэтых вуліц былі адначасна пракладзены тратуары, м.інш. на вул. Ракавецкага і вул. Саланевіч ды часткова на вул. Мілкоўскага па вул. Доўгай.

Не мае тратуара вул. Кнеўскага. А ёй вельмі прыдаўся б хаця б на адным баку. Гэтая даволі доўгая вуліца спалучае вул. Беластоцкую з вул. Мілкоўскага і вул. Врублеўскага, якая вядзе ў напрамку вул. Ліпавай і бальніцы. Усе, каму трэба ў бальніцу і высядаюць з аўтобса ПКС каля Хімічнай фабрыкі, вымушаны ісці па маставой, а гэта небяспечна.

Там, дзе быў прыгожы міні-парк

У Гайнаўцы ўсё менш і менш дрэў. Раней быў прыгожы невялікі парк па вул. Антонія Дзевятоўскага. Тут асталіся прыгожыя старыя дрэвы. І вось вадзіцелі якраз пад імі ў гэтым парку пачалі ставіць свае самаходы. Гэтым самым яны ўсё больш і больш руйнуюць гэтае прыгожае месца.

Дзіўна гэта, але факт. Побач знаходзіцца новапабудаваная вялікая стаянка для аўтамабіляў перад Гайнаўскім домам культуры і другая каля Свята-Троіцкай царквы. Цікава, хто дазволіў зліквідаваць тут агароджу, якая аддзяляла парк ад вуліцы. Зараз па ёй ні следу.

Басейн яшчэ сёлета?

Побач Белліцэя ў Гайнаўцы будуюць крыты басейн для плавання. Бельска-Падляшскае будаўнічае прадпрыемства „Польбуд" яшчэ перад зімой прыкрыла будынак. У ім шмат вялікіх акон. Гэты сучасны будынак з цэглы мае арыгінальную архітэктуру.

У гэтым аб'екце запланавалі два басейны: адзін для дарослых і другі для дзяцей ды вежу са з'язджальняй. Калі ўсё пойдзе згодна з планам, аддадуць яго ў карыстанне летам 2008 года. Тады і не трэба будзе больш ездзіць на басейн у Бельск-Падляшскі або ў Беласток.

Непаладкі ў парку

Зараз, вясной, выбраўся я на на веснавую прагулку на прыродзе. Пайшоў у гарадскі парк з прыгожымі бярозамі ў Гайнаўцы па вуліцы Паркавай. І што ўбачыў? Перш-наперш пяць паламаных паркавых лавачак. Апрача гэтага ўсе лавачкі неабходна памаляваць. Некаторыя з іх, як кажуць, фарбы яшчэ не бачылі! Яны брудныя, запыленыя.

Гарадскім уладам варта гэтым зацікавіцца ды добраўпарадкаваць прыгожы абшар з векавымі дубамі і бярозамі. Гэта ж месца самага лепшага адпачынку. Тут вось-вось на дрэвах закрасуюць першыя зялёныя лісточкі.

(ян)

90-я ўгодкі БНР у Гданьску і Сопаце

Святкаванне 90-х угодкаў абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, як што год, пачалося 25 сакавіка са складання вянкоў на магіле заслужанага для беларускай справы дзеяча Лукаша Дзекуць-Малея. Былі кветкі ад яго нашчадкаў, прэзідэнта горада Гданьска, Беларускага культурнага таварыства „Хатка" і беларускіх жыхароў Трыгорада.

На сходах Двара Артуса пры Доўгім Таргу

Беларускія студэнты, якія вучацца ў Гданьскім універсітэце ў рамах польскай урадавай стыпендыяльнай праграмы імя Каліноўскага, пад бел-чырвона-белым сцягам сарганізавалі беларускі хепенінг у цэнтральным месцы старога Гданьска — на сходах Двара Артуса пры Доўгім Таргу.

Яўген Сафонаў адчытаў заклік да жыхароў Гданьска, каб былі „solidarni z Białorusią".

29 сакавіка ўрачыстасць у гонар 90-х угодкаў працягвалася пры помніку Янку Купалу ў Гданьску і ў Дворку Серакоўскіх у Сопаце. Пры помніку старшыня БКТ „Хатка" Лена Глагоўская прачытала патрыятычныя вершы Янкі Купалы, якія да гэтай пары не страцілі актуальнасці, узяўшы пад увагу сённяшнюю сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь. Парадоксам з'яўляецца тое, што святкаванне дня незалежнасці адбываецца не ў незалежнай дзяржаве, але па-за яе межамі. Другі парадокс — гэта тое, што з аднаго боку Еўропа яднаецца, з другога тая ж Еўропа жадае беларусам і Беларусі поўнай незалежнасці, вядома, у дэмакратычных умовах.

Да святкавання 90-х угодкаў у Дворку Серакоўскіх у Сопаце прымеркавана была прамоцыя зборніка вершаў „Там і тут" Мікалая Дварэцкага. Зборнік вершаў проста з друкарні, пахучы друкарскай фарбай, трапіў на ўрачыстасць. Да гэтай пары вершы Мікалая Дварэцкага ў рукапіснай форме існавалі ў паасобных сшытках, раскінутых па розных краінах свету. Зборнік „Там і тут" паўстаў дзякуючы намаганням Лены Глагоўскай, якая вершы „сабрала, апрацавала і ўступам папярэдзіла". Зборнік быў прафінансаваны і выдадзены стараннямі перад усім сына паэта Юркі Дварэцкага пры тэхнічнай дапамозе Андрэя Васькевіча. Прамоцыя адбылася на фоне вялікіх фатаграфій беларусаў з Меляшкоў (выстава фатаграфій «Меляшкі» Паўла Гжэся — 7.03-10.04.2008), якія разам з радкмі вершаў Мікалая Дварэцкага, прачытанымі студэнтамі Яўгенам і Надзеяй, стварылі праўдзівую беларускую атмасферу ў гістарычным сопацкім Дворку Серакоўскіх.

Працяг сяброўскай сустрэчы ўсіх удзельнікаў свята адбыўся ў сопацкім памяшканні „Хаткі" за багатым сталом.

Жыве Беларусь!

М. К.

Orla, dnia 21 marca 2008 r.

RADA GMINY ORLA
17-106 Orla
ul. Mickiewicza 5
OG. 0625-1/08

Rada Programowa
Tygodnika „Niwa"
ul. Zamenhofa 27
15-959 Białystok

Działając na podstawie art. 31 i 32 ustawy z dnia 26 stycznia 1984 r. Prawo Prasowe (Dz. U. Nr 5, poz. 24 z 1984 r.) w związku z artykułami Michała Mincewicza, które ukazały się w gazecie „Niwa" 2 i 9 marca br. prosimy o opublikowanie poniższej odpowiedzi. Ponadto prosilibyśmy o większą rzetelność dziennikarską gdyż tylko głęboka i oparta na faktach analiza przybliżyć może czytelnikom rzeczywistą sytuację w gminie.

Mając na uwadze dobro Gminy Orla i jej mieszkańców nie możemy spokojnie przyjmować do wiadomości publikacji artykułów Pana Michała Mincewicza, które narażają nas oraz wiele innych osób na utratę zaufania w oczach opinii publicznej. Autor artykułów ocenia fakty wyłącznie poprzez pryzmat własnych korzyści i nie zawsze zgodnie z prawdą przez co swoimi spostrzeżeniami służy kreowaniu złego wizerunku Gminy Orla.

W odniesieniu do artykułu p.t. „U arlanskaj Hminnaj radzie" z dnia 03.02.2008 r. informujemy, iż na posiedzeniu Komisji ds. Samorządu i Mienia Komunalnego Rady Gminy Orla w dniu 24 grudnia 2007 r. Wójt Gminy zaproponował radnym zryczałtowaną dietę w wysokości 350 zł, natomiast Pan radny Michał Mincewicz stwierdził, iż jest to niewystarczająca kwota i zaproponował 400 zł. Do tej pory radni otrzymywali 200 złotych za każde posiedzenie komisji oraz 200 złotych za udział w obradach sesji, czyli 400 zł miesięcznie w tych miesiącach, w których odbywały się sesje. Obecnie otrzymują 400 zł za każdy miesiąc, niezależnie od ilości sesji.

W nawiązaniu do artykułu z dnia 09.03.2008 r. opublikowanego na łamach gazety „Niwa" p.t. „Prawda w oczy kole" informujemy, że:

1) Wójt Gminy nigdy nie zwracał się z prośbą o podwyższenie wynagrodzenia. Nigdy nie było też ono przedmiotem analizy radnych, natomiast mając na uwadze słowa Pana Michała Mincewicza, że Wójt cały czas zwracał się z takimi wnioskami — wniosek takowy zostałby rozpatrzony znacznie wcześniej,
2) w odniesieniu do stwierdzenia Pana Michała Mincewicza że Wójt akceptuje tylko tę prawdę, która jest mu wygodna z całą stanowczością należy stwierdziź, iż prawda jest tylko jedna, niezależnie od tego, czy się to komuś podoba, czy też nie. Nigdy w Gminie nie miało miejsca manipulowanie faktami, ani też podawanie nieprawdy,
3) Pan Michał Mincewicz nie jest jedyną osobą w gminie znającą historię gminy i stwierdzenia typu, że jakby nie radny Mincewicz, to nikt nie wiedziałby, że Orla ma 500 lat, są kuriozalne.

Należy również nadmienić, iż stwierdzenia typu, iż Wójt przyszedł do Gminy Orla tylko dla pieniędzy świadczą o braku kultury i znajomości spraw gminnych przez Pana Michała Mincewicza. Na terenie Gminy Orla w 2007 r. zostały wykonane inwestycje za 2 077 885,88 zł, w przeciągu roku udało się pozyskać środki z zewnątrz w wysokości 688 657,08 zł, co świadczy o tym, że w ciągu jednego roku wykonano więcej inwestycji, niż przez całą poprzednią kadencję tj. przez lata 2002-2006.

Reasumując stwierdzamy, iż artykuły publikowane w „Niwie" są krzywdzące dla mieszkańców Gminy Orla. W przypadku dalszego pojawiania się artykułów o podobnej treści, bez rzetelnej analizy faktów w nich przedstawianych Radni Rady Gminy Orla oraz Wójt Gminy Orla skierują sprawę na drogę postępowania sądowego, przeciw autorowi artykułów oraz redaktorowi naczelnemu, gdyż publikowane na łamach gazety artykuły szkodzą dobremu wizerunkowi Gminy Orla.

Пад лістом знаходзяцца подпісы трынаццаці радных гміны Орля і войта Пятра Сэльвесюка.

Ад рэдактара:

Дзякуем уладам гміны Орля за пастаяннае знаёмства з нашым тыднёвікам, які звыш 50 гадоў апісвае жыццё беларусаў Беласточчыны, у тым ліку і Вашай гміны. На аснове матэрыялаў нашых журналістаў і карэспандэнтаў чарговыя пакаленні могуць даведвацца як выглядалі справы ў Арлянскай гміне. Неад'емным правам дэмакратыі і журналістыкі з'яўляецца магчымасць свабоды выказванняў, права на ўласныя ацэнкі рэчаіснасці асабліва асоб, якія хацелі стаць абраннікамі народу. На добрае імя і карысны вобраз гміны Орля, на маю думку, працуюць усе яе жыхары незалежна ад поглядаў ці становішча. А час і выбаршчыкі найлепшыя суддзі. З павагай да ўладаў гміны Орля і ўсіх яе жыхароў:

Яўген Вапа — галоўны рэдактар „Нівы"

Пажарнікі ў Арлянскай гміне

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Арлянскія пажарнікі Міраслаў Ахрыцэвіч і Міхал Таранта кладуць тратуар (2000 год)

Штогод гмінныя радныя атрымліваюць інфармацыю пра рэалізацыю задач па супрацьпажарнай ахове. Як паведаміў працаўнік Гміннай управы Аляксандр Багацэвіч, на тэрыторыі Арлянскай гміны дзейнічае сем добраахвотных пажарных каманд; усе яны занесены ў краёвы судовы рэгістр. Добраахвотная пажарная каманда з'яўляецца абмундзіраванай часцю, абсталяванай спецыяльнай апаратурай для змагання з пажарамі, стыхійнымі бедствамі ці іншымі мясцовымі пагрозамі. Кошты абсталявання, утрымання, абучэння і ўтрымання боегатоўнасці пажарнікаў нясе гміна. Гміна таксама запэўнівае абмундзіраванне, страхаванне пажарнікам ды кошты іх перыядычных медыцынскіх аглядаў. Зараз у Арлянскай гміне 189 пажарнікаў, у іх ліку 145 дзейных, 5 дапаможных і 17 ганаровых. Пры арлянскай камандзе паўстала жаночая дружына з сямі асоб ды маладзёжная дзявочая і хлапечая каманды па 14 чалавек кожная.

Паасобныя каманды на тэрыторыі Арлянскай гміны розныя па ліку членаў:

— у Орлі 72 пажарнікі, у тым ліку 26 звычайных, 11 ганаровых, 5 дапаможных, 7 жанчын і 28 маладых людзей;

— у Вульцы-Выганоўскай 21 пажарнік: 19 звычайных і 2 ганаровых;

— у Спічках 16 звычайных;

— у Рудутах 14 звычайных;

— у Рыгораўцах 15 звычайных;

— у Малінніках усіх 30, у тым ліку 6 ганаровых;

— у Градалях 24 звычайныя пажарнікі.

Выратавальна-тушыльныя каманды ў Орлі і Рыгораўцах маюць мадэрнізаваныя машыны на шасі „Камаза", каманда ў Малінніках карыстаецца машынай „Star", а дружыны ў Рудутах і Вульцы-Выганоўскай самаходамі „Żuk". Апрача гэтых арлянская каманда мае ў распараджэнні машыну „Lublin" для тэхнічнага ратаўніцтва. Усе дабравольныя каманды маюць мотапомпы. Абсталяванне і будынкі пажарных дэпо з'яўляюцца ўласнасцю гміны.

У 2007 годзе на ўтрыманне пажарных дружын у Арлянскай гміне выдаткавана звыш трыццаці тысяч злотаў. Гэтыя сродкі былі прызначаны на куплю паліва, дробныя рамонты тэхнікі ды выплату эквіваленту пажарнікам за ўдзел у тушыльных акцыях. Апрача гэтага была куплена мотапомпа для каманды ў Малінніках ды перакрыта дах дэпо ў Орлі. Заказаны новыя дзверы дэпо ў Малінніках ды купля форменнай вопраткі для пажарнікаў з Рудут. Арлянская каманда атрымала звыш пяцітысячную датацыю ад галоўнага каменданта Дзяржаўнай пажарнай аховы на ўтрыманне баявой гатоўнасці.

Як паінфармаваў гмінных радных Ян Шкода з Павятовай камендатуры пажарнай аховы, з тэрыторыі Бельскага павета ў Краёвую выратавальна-тушыльную сістэму ўключана дзевяць дабравольных пажарных каманд, якія ў 2006 годзе атрымалі з бюджэту краіны датацыю вартасцю звыш 50 тыс. зл. З гэтага ліку арлянская дружына атрымала 4,1 тыс. зл., за якія купіла мотапомпу „Niagara", радыётэлефон і шлем.

Пажары на Бельшчыне

У Бельскім павеце расце колькасць пажараў, асабліва на вясковай тэрыторыі; іх галоўнай прычынай з'яўляюцца падпалы. У першым паўгоддзі 2007 года ў павеце ўспыхнула 147 пажараў, найбольш у горадзе Бельск (48) і ў Бельскай гміне (33); шмат было іх і ў Арлянскай гміне — 19 (гэта на 13 менш чым годам раней за такі ж перыяд; у іх ліку не было фальшывых трывог). Бельскія пажарнікі ў 2006 годзе выязджалі да тушэнняў што 31 гадзіну, а годам раней кожныя 39 гадзін.

Паводле пажарнікаў найбольшая пажарная пагроза выходзіць з сельскай гаспадаркі. Тэхнічны прагрэс прынёс новыя пагрозы; гэта перш за ўсё сельскагаспадарчая тэхніка і электрычнае абсталяванне. Значны ўплыў на пажарную ўразлівасць мае дэмаграфічнае становішча. Цяпер на вёсках многа пустых будынкаў, якіх ніхто не пільнуе. У такіх умовах часта здараюцца падпалы або выпадковыя зацерушэнні агню. Найбольшая небяспека вісіць над адзінокімі стадоламі.

Рост колькасці пажараў у вёсках наглядаецца недзе ад дзесяці гадоў. На Бельшчыне за апошнія дзесяцігоддзі ўспыхнула каля дваццаці вялікіх пажараў. Найбольшы з іх здарыўся ў 1971 годзе ў Рудцы, у выніку якога згарэла 14 гаспадарчых будынкаў і адзін жылы. За гэты перыяд у Арлянскай гміне здарылася пяць вялікіх пажараў, якія паглынулі 16 клуняў і 11 хлявоў. Да 2001 года ў Бельскай гміне ў чатырох пажарах пайшлі з дымам 13 клуняў, 8 гаспадарчых і 3 жылыя будынкі.

У 2000 годзе пажарнікі Бельшчыны выязджалі больш за 400 разоў да розных выпадкаў (на сто больш чым годам раней). Але ў 2006 годзе было аж 595 выездаў (годам раней 552), у тым ліку 278 разоў да тушэння пажараў (годам раней 222). У 2000 годзе з ліку 230 пажараў у 56 выпадках прычынай былі наўмысныя падпалы. За той перыяд згарэла 29 клуняў, 10 з іх у выніку падпалаў. У 2002 годзе з 226 пажараў 36 былі вынікам наўмысных дзеянняў, у 2005 годзе з 251 пажара — 40. У Арлянскай гміне ў 2005 годзе з 19 пажараў два былі вынікам наўмысных падпалаў; годам пазней падпалаў не зафіксавана.

У прынцыпе падпалы будынкаў здараюцца ноччу, падпалы лясоў — у дзень. Падпальшчыкамі з'яўляюцца пераважна мужчыны ва ўзросце да 35 гадоў; пірыманамі займаюцца псіхіятры.

У палове 1990-х гадоў у Бельскай гміне агонь падкладваў 17-гадовы юнак. У пяцікіламетравым радыусе ўзбудзіў ён 20 пажараў будынкаў і лясоў; трапіў ён за гэта ў турму.

У 1998 годзе ў Ігнатках Вышкаўскай гміны пірыман падпаліў дом па заказе. Разлічваў ён, што ягоныя сляды прыкрые снег. І хаця падпальшчык адышоў у завіруху за сем кіламетраў, яго даганілі паліцэйскія, без сабакі. А ў адной з гмін падпальшчыкам аказаўся пажарнік-дабраволец.

Здараецца, што пажар учыняюць уладальнікі падпаленых аб'ектаў. У 2001 годзе адна бяльшчанка падпаліла свой мясны аптовы склад з мэтай выманіць кампенсацыю ад страхавой кампаніі.

У час пажару, як і пры іншых здарэннях, можна наглядаць характэрную псіхалагічную з'яву: натоўп людзей збіраецца не для дапамогі ў тушэнні агню ці ратаванні маёмасці, але каб паглядзець на агонь, пракаментаваць здарэнне. Бывае, што на пажар бягуць пажылыя людзі з суседніх мясцовасцей, і то ноччу. Разявакі стаяць і прыглядаюцца, як пажарнікі, рызыкуючы здароўем і жыццём, змагаюцца з агнём, як хвалююцца шакіраваныя пацярпелыя. Гледачы вядуць сябе як бальшчыкі на матчы або публіка на спектаклі. Здараецца, што сярод такіх разявак прысутнічае і падпальшчык.

Пашкадаваў тэлефона

Аказваецца, што нават у трагічны момант людзі паводзяць сябе негуманна і подла. Вось што расказаў мне гмінны пажарны камендант Міраслаў Бало, зараз таксама член Рады Бельскага павета:

— У апошнюю нядзелю мая 1999 года на тэрыторыі павета ўспыхнула сем пажараў. Калі арлянскія пажарнікі прыехалі ў Кнаразы, агонь быў там ужо амаль патушаны. І раптам да нас падбег чалавек з весткай, што на калоніі загарэлася клуня. Заехалі мы першымі, а там стаіць жанчына і плача. Гаворым ёй, што запозна нас паведаміла, бо клуня ўжо дагарала, а яна стала нам расказваць, што сусед, у якога быў тэлефон, не дазволіў ёй пакарыстацца ім. Высветлілася, што яны калісь пасварыліся і нават у такую трагедыю пашкадаваў ён суседцы пакарыстацца тэлефонам. Жанчыне давялося бегчы да тэлефона ў аддаленую за тры кіламетры вёску.

Залатая каманда ў Орлі

Дабравольная пажарная каманда ў Орлі была заснавана 86 гадоў таму. Гэта найстарэйшая і найбольш заслужаная для мясцовага грамадства арганізацыя. У яе радах захоўваецца і развіваецца звычай несці дапамогу ўсім тым, што яе патрабуюць. Дзесяць гадоў раней каманда атрымала залаты медаль і новую пажарную машыну.

Зараз пажарная ахова ў Арлянскай гміне ў добрым стане. Але людзі помняць, што бывала і так, калі гутарка пра пажарнікаў заводзілася тады, калі ўстарэлай тэхнікай не ўдавалася ім патушыць пажару і наступала трагедыя. У 1990-х гадах у 150 метрах ад арлянскага дэпо згарэў будынак з чалавекам усярэдзіне. Годам пазней падобная трагедыя здарылася ў Кашалях.

Пажарнікі, асабліва сярэдняе пакаленне, дбаюць таксама і пра дэпо. Самі выканалі там многа працы, адрамантавалі і змадэрнізавалі будынак звонку і ўсярэдзіне. І хаця выглядае ён імпазантна, сумна ў ім. Раней адбываліся там часта танцавальныя забавы, а цяпер галоўным чынам памінкі. Аднак гэтае памяшканне не мае адпаведнага абагравання і ўдзельнікі трызны наракаюць на холад.

Вярнуць ранейшую красу

Неіснуючае ўжо здаўна Таварыства прыяцеляў Белавежы давяло ў 1968 годзе да трывалага азначэння геаметрычнай сярэдзіны Белавежскай пушчы. Дзеячы таварыства, на чале са старшынёй Янушам Б. Фалінскім, знайшлі на Белавежскай паляне валун памерамі 1,90 х 3,40 х 1,20 і акружнасці 8,70 метра ды змясцілі яго на пастаменце ў тым жа выключным месцы. А знаходзіцца яно ля шашы, на левай пабочыне, пры ўездзе ў Белавежу з гайнаўскага напрамку. Турыстам гэтая ініцыятыва вельмі спадабалася. Шматлікія з іх ахвотна рабілі сабе на фоне валуна памятныя здымкі з экскурсіі ў белавежскія нетры. Адпаведная інфармацыя аб сярэдзіне пушчы змяшчалася на дзвюх бронзавых дошках, прымацаваных на пастаменце.

Напрыканцы мінулага стагоддзя нейкі злодзей адкруціў ад пастамента і забраў інфармацыйныя дошкі. Найхутчэй з думкай аб іх продажы на скупцы металалому. Месца з валуном стала адгэтуль надта маркотным, запушчаным. Турысты здзіўляліся, чаму няма аб ім аніякай інфармацыі. Чарговыя мясцовыя гмінныя ўлады быццам не заўважалі праблемы.

Зварухнулася нешта ў гэтай справе толькі пад канец мінулага года. У лістападзе ўпарадкавана было акружэнне валуна. Расставілі тут таксама прыстрэшак і дошку з картай Белавежскай пушчы, на якой памечаны веласіпедныя шляхі. Зараз белавежская гмінная ўстанова ўстанаўлівае змест украдзеных дошак, з думкай аб іх аднаўленні. Аднак дошкі будуць зроблены на менш каштоўным матэрыяле, які не будзе спакушаць п'янчуг.

Затым можна спадзявацца, што на сваё 40-годдзе азначэнне сярэдзіны пушчы ізноў будзе поўнасцю красавацца. Чакаем!

Пётр БАЙКО

Новыя інвестыцыі

У мінулым годзе ў Нараўчанскай гміне прыбыло больш лепшых дарог і тратуараў, між іншым, паклалі асфальт на дарозе ў вёску Стачок ад шашы Нараўка — Гайнаўка, мадэрнізавалі дарогу з Семенякоўшчыны ў Баб'ю Гару, адрамантавалі гравійку з вёскі Новае Ляўкова да прысёлка.

Закончылі пабудову каналізацыі ў Міклашэве. Пабудавалі новы тратуар у Старым Ляўкове і па вул. Міцкевіча ў Нараўцы. Адрамантавалі святліцу ў Старым Ляўкове.

(ян)

Адрыяну Аверчуку

словы шчырага спачування з прычны напаткаўшага Яго гора

трагічнай смерці Бацькі

выказваюць сяброўкі, сябры, выхавацель і бацькі вучняў III „б" класа Гімназіі № 3 у Бельску-Падляшскім.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Як у Шудзялаве захоўвуюць спадчыну

Калі спытаеце ў Шудзялаве пра гурток беларускай мовы, вам адкажуць адно: яны прыгожа спяваюць! Сапраўды яно так.

Ужо на прывітанне дзяўчаты са спадарыняй Людмілай праспявалі сваю любімую песню: „А я ўсё дзіўлюся, дзе ж ты, мая Маруся?" Пасля мы сядзелі за салодкім сталом у рэгіянальнай зале, аздобленай вышыванымі ручнікамі і сельскагаспадарчымі экспанатамі ды з кампакт-дыска слухалі песень хору „Загадка" з суседняй Супраслі. Аднак па чарзе...

У госці да нашых сяброў у Шудзялава я падалася з цікавасцю і, што тут казаць, з пэўным хваляваннем. Чаму? Таму, што люблю Сакольшчыну, яе маляўнічыя ўзгоркі і лясы, смачную ваду „Крынку", мясцовыя песні і гасцінных людзей.

Белы будынак школы відаць ужо здалёк. Напамінае ён пагранзаставу на ўзбярэжжы Кнышынскай пушчы. Тут працуюць гімназія, пачатковая школа і прадшколле. Дзесьці пад 300 школьнікаў. Кожны дзень, пакуль школьны аўтобус пазбірае дзяцей і моладзь з самых далёкіх вёсак і лясных урочышчаў ды прывязе іх у школу, шмат часу пройдзе ў дарозе. Гэта не жарты, адзін такі маршрут доўжыцца за сто кіламетраў! У самых адлеглых кутках гміны школьніку трэба прачынацца ў шэсць гадзін раніцы або і раней. Давоз не мяшае, наадварот, магчыма, што далёкае падарожжа ўзбуджае ўяўленне і прыгожыя мары...

Ад трох гадоў у Шудзялаве працуе гурток беларускай мовы. Заняткі прысвячаюцца не адно песням, але і краязнаўчым ды займальным літаратурным урокам.

— Мы карыстаемся нашай „простай" мовай, — кажа настаўніца Людміла Клімук. — Збіраем легенды, назвы ўрочышчаў, запісваем успаміны старэйшых людзей...

— Ці гэта праўда, што легенды і ўспаміны дзеці запісваюць лацінкай, або, як кажуць у нас, польскімі літарамі? Пра апошную цікавінку я прачытала ў беларускай газеце, якая выходзіць у Маладзечне.

— Я сама паланістка, — кажа спадарыня Людміла, — ніколі ў школе не вучылася беларускай мовы. Гутарковую мову ведаю з хаты і ад тутэйшых людзей. Хоць у школе ўсе яшчэ вывучаюць рускую мову, зручней пісаць лацінкай. З разуменнем літаратурнай мовы няма цяжкасцей. Калі дзецям чытаю кніжку на беларускай мове, яны разумеюць змест.

— А ці вы таксама размаўляеце з бацькамі па-просту? — пытаю ў пяцікласнікаў.

Дзяўчаты з гуртка з настаўніцай Людмілай Клімук

У гуртку займаецца сем дзяўчат з пятага класа. Некаторыя з іх мясцовыя, іншыя даязджаюць з навакольных вёсак.

— Я крыху размаўляю з мамай, — кажа Наталька Алекша родам з Піражкоў.

У Наталлі — вялікая мара. Яна хоча вывучыць беларускую мову, каб свабодна размаўляць з бабуляй Марыяй, якая жыве ў Беларусі.

— Мая мама родам з вёскі Канюхі, — кажа Наталька. — Там жывуць мая бабуля і цёця. І мы ездзім у Беларусь у госці, два або больш разоў у год. Дзякуючы гуртку я зразумела, што нашы мова і культура вельмі бізкія і падобныя на сябе.

Матыльда Буслоўская нарадзілася і выхавалася ў Беластоку. Зараз яна жыве ў Лазнісках. На гурток ходзіць першы год. Яна таксама хоча вывучыць беларускую мову, каб пагутарыць са сваім дзедкам:

— Мой дзед нейкі час жыў у Беларусі і часта апавядаў мне пра сваё жыццё. Ён ведае многа прыказак, анекдот і беларускіх песень. Я хачу добра вывучыць беларускую мову, каб пазітыўна здзівіць дзядулю.

У групе бачу знаёмую дзяўчынку. Гэта Юстына Варановіч. Раней вучылася яна ў Бабіках. Разам са старэйшай сястрой Паўлінай і братам Паўлам хадзілі там на ўрокі беларускай мовы. Юстына з сентыментам успамінае дэкламатарскі конкурс „Роднае слова", экскурсію ў Беларусь і паездку ў рэдакцыю „Нівы". Таму яна ўцешылася, калі ў Шудзялаве стварылася магчымасць працягваць навуку беларускай мовы.

Пытаем пра пачаткі гуртка. Адкуль узялася думка, каб рабіць такую карысную, патрэбную ў наш еўрапейскі час справу? Адкрываць дзяцей на сваё, пазбаўляць іх комплексаў непаўнацэннасці. На першае пытанне адказвае дырэктар школы Багдан Альховік:

— Ідэю прыдумаў наш войт, — кажа дырэктар. — Такія заняткі дасканала ўпісваюцца ў праграму рэгіянальнай адукацыі. Для школы гонар, калі дзеці цікавяцца сваёй сям'ёй ці мясцовасцю. Добра, што знайшліся настаўніцы, якія павялі гурток.

— Спачатку я вяла заняткі разам з настаўніцай Аннай Сятэйка, — кажа Людміла Клімук. — Мая сяброўка вывучала беларускую мову, дзякуючы ёй мы змаглі ўвесці алфавіт і пакарыстацца метадычнымі дапаможнікамі па беларускай мове. І можна сказаць, што ўсё пачалося з літаратурнага конкурсу, які арганізаў наш Дом культуры. Я і мае сяброўкі паланісткі прыдумалі ідэю, каб падрыхтаваць творы вучняў на трох мовах: польскай, рускай і на нашай „простай" мове. Я ўзялася за апошню справу, бо лічу, што варта захаваць нашу спадчыну ад забыцця. Дзеці адразу падхапілі прапанову. Яны запісвалі не толькі расказы сваіх бабуль і дзядуляў, часта іх субяседнікамі былі старэйшыя вяскоўцы.

Нягледзячы на невялічкі час існавання гуртка, ужо відавочныя вынікі. Сярод конкурсных твораў з'явіліся легенды, сямейныя гісторыі і ўспаміны, запісы лакальных назваў палёў, лугоў, дарог. Усё на мясцовым дыялекце. Адны з іх запісаны лацінкай, іншыя кірыліцай (апошнія запісы зроблены ўручную, бо ў гміне няма клявіятуры з беларускім алфавітам). Сабраная спадчына захоўваецца ў Доме культуры, хоць найважнейшае тое, што астаецца ў памяці і душы маладога збіральніка, іх роздумы пра навакольную прыроду, людзей ці абрады. Усё гэта дапаможа будаваць сваё асабістае жыццё. Зараз таксама тут рыхтуюцца да конкурсу.

— А ці ведаеце ўжо тэмы сваіх конкурсных прац? — пытаю ў спадарыні Клімук.

— Хочам, каб вучні пісалі пра сувязь чалавека з пушчай, бо 2008 год лічыцца Годам Кнышынскай пушчы, — чую ў адказ.

Невыпадкова расказ пра гурток мы пачалі з беларускіх песень. Сярод дасягненняў групы маюцца таксама музычныя падзеі. У калядны перыяд моладзь выступіла ў мясцовым касцёле з беларускімі калядкамі. Яны заспявалі „Паказалася ў небе яснасць небывала", „Хто да ясляў", „Ціхая ноч" на польскай і беларускай мовах ды адну народную беларускую песню...

— І як успрынялі людзі ваша выступленне?

— Вельмі цёпла! — кажа дырэктар Багдан Альховік.

Шкада, што гурток беларускай мовы дзейнічае толькі ў Пачатковай школе. Як заявілі ўсе дзяўчаты, яны хацелі б працягваць гэтыя заняткі ў гімназіі.

Тэкст і фота
Ганны КАНДРАЦЮК

Ганна Валынец, 13 гадоў. *Любімыя матывы*

Музыка з кайфам

Памідор ... нібыта востры перац

Прынялося, што памідорамі можна кідаць у артыста, калі яго выступ уразіў нас, хутчэй за ўсё ў адмоўным сэнсе. Ёсць у Беларусі музыка, які, мабыць, забяспечыў сваю асобу ад магчымай памідоравай атакі з боку публікі. Хто хацеў бы кідаць памідорамі ў... Памідора? Не ведаю ці дакладна тым кіраваўся Аляксандр Крывашэй, абіраючы сабе такі мастацкі псеўданім, але ў адным я ўпэўнена: ён умее падагрэць публіку да чырвані!

Мая першая пасрэдная сустрэча з вакалістам Памідорам адбылася ў час прэм'еры праекта „Народны альбом" у 1998 годзе ў Бельскуі-Падляшскім, у ходзе фестывалю „Бардаўская восень". Я была захоплена, калі ў рамках беларускага альбома з'явілася песня на мове ідыш, якую выконваў Памідор. Пасля была сустрэча пры нагодзе фестывалю „Басовішча", але пазнаёмілася я з ім толькі ў 2001 годзе. Сяброўства наша, перапоўненае бурамі, але і сонечнымі днямі, прынесла мне шмат разнаколерных успамінаў.

Мне і свету Памідор вядомы як музыка і дыджэй. Дзякуючы характэрнаму голасу можна пачуць яго на радыёстынцыях і ў рэкламах. На „Басовішчы" выконваў падвойную ролю — музыканта і перш за ўсё вядучага канцэртаў, калі зачароўваў публіку сваім талентам і харызмай. Малую рэвалюцыю падрыхтаваў ён слухачам у 2002 годзе, калі з'явіўся яго альбом „Сьвята пакрадзенае", запісаны з праектам Pomidor/OFF. Гэта да сённяшняга дня свежая музыка, спелыя кампазіцыі ды класнае гучанне. Памідор заўсёды мне асацыяваўся з беларускамоўнай творчасцю, мабыць, менавіта таму здзівіў мяне яго канцэртны альбом з 1998 года, на якім усе песні выкананы па-руску. Але трэба помніць, што многія беларускія музыкі карыстаюцца рускай мовай, а частка з іх прайшла працэс беларусізацыі. Мастацкі характар Памідора затое не мяняецца!

Чалавек, пра якога распавядаю, напэўна варты ўвагі слухачоў, а гэта ў першую чаргу з-за яго музычнай асобы. Я не забуду, што вось ён прывозіў мне з Беларусі свае, і не толькі, старыя дыскі рок- і металгуртоў, якія сам з любасцю слухае.

i_basovka@o2.pl

Вершы Віктара Шведа

Кавалер

— Хто гэта кавалер? —
Пытае тату Пеця.
— Найшчаслівейшы, павер,
Чалавек на свеце.

Будзеш, сыночак, ім,
Як дарасцеш, таксама.
Не расказвай аб тым
Толькі нашай маме.

Электрычнае святло

Настаўнік фізікі пытае:
— Ток электрычны уключаю —
Святло запальвацца павінна,
Яго няма. Што за прычына?

— Па-мойму,
— кажа Антаніна, —
Вядомая таго прычына.
Не заплацілі мы, як звычна
Рахунак наш энергетычны.

ГІСТОРЫЯ ПРА СОНЕЧНЫ ЗНАК НА ПЛЯЧЫ

А цяпер зірніце на вуліцу, мае харошыя. Колькі сонца, бачыце?! Так, гэта цуд, гэта вясна! Гэта той самы час, калі дзяўчаткі шыкуюць у кароткіх спадніччках і ўсё смялей агаляюць на яркім, лагодным сонцы свае цудоўныя плечыкі.

Ды толькі адна не меней цудоўная дзяўчыначка Евачка каторы дзень і не думала выходзіць на двор. Самотная, яна сядзела ля акна і ціха плакала. Ну, можа, і не плакала, аднак на краёчках ейных веек прыметна дрыжалі слёзкі.

— Што здарылася? Чаму адна? Чаму не ідзеш з намі? — здзівілася сяброўка Анэлька, калі зайшла надвячоркам.

— Не магу. Вы такія прыгожыя. Вы можаце апрануць самыя вабнотныя сукні. А я — не магу... — і недаравальная вільгаць так і пабегла з вачэй Евачкі.

— Чаму?!

— Таму што..., таму што... — чырванелі ад сораму шчочкі нашай дзяўчынкі. — Таму што Янка — ты ведаеш яго, з паралельнага класа — пацалаваў мяне. Ён дакрануўся вуснамі да маіх плеч. І цяпер...

— Што?

— Вось, — паказала сяброўцы Евачка свае плечы. — На кожным з іх — засталося па знаку. І цяпер іх — не змыць. Не сцерці і не звесці. Нічым і аніяк!..

Анэлька, убачыўшы тыя невялічкія, акуратныя, нязводна-светлыя знакі, толькі ўсміхнулася ў адказ:

— Евачка! А ты ведаеш, што ты цяпер... — адзіная такая?!

— Якая?..

— Яшчэ нікога з дзяўчат у нашай школе не цалавалі так! Каб на кожным плячы. Па сонечным знаку. Што не змыць і не сцерці. Шчаслівая!..

— Так? — лёгкая ўсмешка ўсё яшчэ нясмела кранула вусны Евачкі. — Дык што цяпер рабіць?

— Ганарыцца!

Мілае дзяўчо ўжо смяялася ўголас.

— І хутчэй апранацца! — рашуча дадала Анэлька. — У сваю самую лепшую, самую лёгкую сукню. Каб бачылі — усе!

Евачка з мілай усмешкаю адразу вырашыла скарыстацца з парады сяброўкі. Аднак раптам спынілася:

— Я не хачу, каб усе.

І на пытанне ў вачах Анэлькі адказала проста:

— Толькі каб той, хто пакінуў іх...

На што Анэлька толькі гарэзна заўважыла:

— А ніхто, акрамя Яначкі, і не ўбачыць тых слядоў. Тлумачыць не трэба чаму?

— Не трэба! — рассыпала вакол сябе Евачка радасныя веснавыя жарынкі з вачэй.

Думаю, шаноўныя мае, вам тое тлумачыць не трэба таксама?

Ваш Дзядзечка Сід
9 сакавіка 2008 г., Кобрын

Польска-беларуская крыжаванка № 14

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 10: Рыска, акула, цудак, лак, папараць, карова, кіно, грыб, нам, опера, сук, таз, як. Мацак, рот, купалы, дудар, без, ларок, ракавіна, цана, соль, Омск, адказчык.

Узнагароды, кампакт-дыск „Ilo&friend", выйгралі: **Ася Нявінская** з Бельска-Падляшскага, **Паўліна Юрчук, Малгажата Гаворка** з Гайнаўкі, **Ева Каролька, Дыяна Свірыдзюк, Альжбета Сідарук** з Чыжоў. Віншуем!



Зацікавіць людзей

Размова з ***Міраславам СТЭПАНЮКОМ****, старшынёй управы Мясцовай групы дзеяння „Белавежская пушча".*

— Пра Вас я пачуў у Сацах, у Краіне адкрытых аканіц. Гэта быў Ваш праект?

— Ну, я быў адным з сааўтараў гэтага праекта. Сама назва праекта не мая, але ідэя так. Бо назву задумаў чалавек з-па-за нашага рэгіёна. Падобны праект быў рэалізаваны раней на Кашубах, дзе паявілася Kraina w kratę. Яго аўтарам быў д-р Януш Маеўскі з Сельскагаспадарчай акадэміі ў Познані, які займаецца м.інш. агратурызмам. Супрацоўнічаў ён з намі пры рэалізацыі розных праектаў, м.інш. Дацкага агенцтва аховы асяроддзя, які мы рэалізавалі ў рэгіёне Белавежскай пушчы разам з Паўночнападляшскім таварыствам аховы птушак. Але самую назву Краіны адкрытых аканіц задумаў ён. Нам важна было, каб пачаць ахоўваць тыя мясцовыя элементы, каб звяртаць на іх увагу: на архітэктуру, на дэкор, якія знікаюць з нашага атачэння. Некалькі гадоў назад пра гэта зусім не гаварылася і быў гэта такі момант, калі Паўночнападляшскае таварыства аховы птушак рэалізавала свае прыродаахоўныя мерапрыемствы ў даліне Нарвы, скупляючы зямлю каб там ахоўваць птушак і выпадкова з'явілася патрэба крыху інакш адносіцца і да людзей. Нельга накідаць нейкіх форм аховы, пра якія людзі нават не ведаюць. Тут быў свайго роду зачын грамадскага руху, бо птушкі з'яўляюцца прыродным элементам пастаянна прысутным побач людзей і мы хацелі паказаць, што ахова прыроды не з'яўляецца нечым адмоўным, што яе элементы можна скарыстоўваць для турызму ці сельскай гаспадаркі, што можна здабываць, напрыклад, даплаты на абкошаныя абшары. І так пасля сталася, што з'явіліся тыя прыродаахоўныя даплаты і юрыдычныя падставы для іх. Але тады то яшчэ быў пачатак. І яшчэ мы хацелі паказаць людзям, што маем і для іх цікавыя прапановы. Я там таксама маю сваю такую гаспадарку: хату, клуню, стары свіран, і там мы пасля зарэгістравалі згуртаванне Спадчына Падляшша і сталі рэалізаваць таксама шэраг іншых праектаў. Першы быў скіраваны ў тым напрамку, каб паказаць людзям, што яны маюць нешта каштоўнае.

— Як да гэтага паставіліся людзі?

— Трэба зазначыць, што калі хто прыходзіць звонку, то людзі не маюць да яго вялікага даверу. І спачатку мы запланавалі аднаўленне дваццаці хатаў, бо на столькі здабылі мы сродкі.

— І пачыналі Вы ад нейкай канкрэтнай вёскі?

— Так, пачыналі ад дзвюх вёсак, ад Сацоў і Пухлаў, дзе мы задумалі адмаляваць і папоўніць дэкор. І пачалі гаварыць з людзьмі. І спачатку то было даволі цяжка, бо людзі баяліся, што калі хто нечага хоча, і калі нават штось дасць, то напэўна каб пасля штось забраць. Але ў наш праект быў заангажаваны і вядомы скульптар Наумюк з Канюк, бо мы стараліся ўключыць у нашу ініцыятыву і мясцовых людзей. Калі мы выпусцілі буклет, то і турысты паявіліся і пачало нешта варушыцца. Праўда, не было яшчэ да чаго тых турыстаў прыцягнуць, каб іх затрымаць, бо няма там для гэтага базы. Стараемся неяк тую базу рушыць, але гэта праблема, бо так то ёсць на нашых вёсках, дзе асталіся адно старэйшыя людзі, якія не маюць у гэтым патрэбы.

— А з людзьмі як Вы гаварылі: хадзілі ад хаты да хаты ці мо нейкі сход зрабілі?

— Далі павестку, солтыс інфармаваў, наладзілі сустрэчу. Але ў сапраўднасці то так хадзілі ад хаты да хаты. Не кожная хата падыходзіла да ўключэння яе ў праграму. Такія былі пачаткі. Пасля быў іншы праект, таксама звязаны з архітэктурай, але больш уліковага характару: фатаграфавалі і апісвалі дэкор ды выконвалі ўлік прысядзібных агародчыкаў.

— Таксама ў Сацах і Пухлах?

— Так, у тых дзвюх вёсках. І ў гэтым праекце ўдзельнічала больш людзей. Маладыя людзі спісвалі расліны, гутарылі з бабулькамі як было калісь у агародах, было падвядзенне працы. Раней мы выканалі сертыфікаты прысядзібнага агарода, калі было ў ім па пяць або і больш традыцыйных раслін; бывалі і такія агароды, дзе садзілі і больш дваццаці відаў раслін.

— І тое, што Вы спісалі, ці будзе неяк захавана?

— Мы сваю работу праводзім дзеля прамоцыі, бо ў пазнейшым буклеце мы ўжо адвялі месца не толькі дэкору, але і агародам ці сакральным аб'ектам. Але мы на аснове сабранага намі матэрыялу ствараем базы даных для пазнейшага распаўсюджвання, каб пасля выкарыстаць іх для набору каталогаў дзеля выкарыстання для іншых праграм. Напрыклад, мы выканалі каталог дзесяці камплектаў дэкору для хат на аснове традыцыйнага будаўніцтва ў Нарваўскай і Нараўчанскай гмінах. Ён мае не толькі прамацыйную мэту, але ўжо і канктэтную ўжытковую, каб людзі ім карысталіся, калі, напрыклад, захочуць аднавіць якуюсь хату, якая ўжо страціла свой дэкор, або хто можа захоча пабудаваць новую хату і пакарыстацца ранейшым дэкорам.

— Вы згадвалі спачатку пра дзве вёскі, а цяпер ужо пра большую тэрыторыю. Які быў тэрытарыяльны прагрэс Вышых праектаў?

— Праект набывае штораз шырэйшы абсяг. Мы ўжо ідзем у напрамку ахопу нашым улікам усяго радыуса дзеяння нашай Мясцовай групы, які ўключае тэрыторыю дзесяці гмін: усіх васьмі з Гайнаўшчыны і дзвюх з Бельшчыны: Арлянскай і Бельскай. І мы там выканалі комплексную інвентарызацыю ўсіх архітэктурных каштоўнасцей з улікам усіх тых аб'ектаў, якія былі ўжо раней занесены ў спіскі памятак і тых каштоўнасцей, якія варта ў тыя спіскі занесці. І нашы запісы мы перадалі ў электроннай форме ўсім гмінам, кожная гміна гэта атрымала. І на гэтай аснове гміны могуць прапанаваць унясенне сваіх аб'ектаў у ваяводскі ўлік дзеля пазнейшага патэнцыйнага дафінансавання для тых аб'ектаў.

Вынікам нашых праектаў была і публікацыя працы Артура Гавела пра архітэктурны дэкор.

— І Ваша Мясцовая група дзеяння дала зачын для гэтай працы?

— Спадар Гавел з'яўляецца працаўніком Падляшскага музея, пад шыльдай якога выйшла ягоная праца. Пачаткам нашага супрацоўніцтва быў праект „Пушча без граніц", рэалізаваны ў Польшчы і Беларусі. Я каардынаваў той праект і запрасіў да супрацоўніцтва розныя суб'екты. І вынікам таго супрацоўніцтва стала заснаванне згуртавання Спадчына Падляшша. І спадар Гавел таксама далучыўся да таго згуртавання дзеля ўдзелу ў падобных праектах, м.інш. „Культурная спадчына рэгіёна Белавежскай пушчы". А публікацыі выходзяць пад рознымі шыльдамі, бо гэтак здабываюцца грошы; да згаданай працы падключылася і выдавецкая суполка Orthdruk.

— Вы сказалі, што склалі спісак найбольш каштоўных аб'ектаў з тэрыторыі гмін, якія з польскага боку ахоплівае еўрарэгіён Белавежская пушча. Якое тэрытарыяльнае размеркаванне гэтых аб'ектаў па гмінах, дзе іх найбольш?

— Я магу сказаць дзе іх найменш — найменш іх у Нараўчанскай гміне і ў паўднёвых: Кляшчэлеўскай і Чаромхаўскай. А найбольш традыцыйнай драўлянай архітэктуры ў Нарваўскай гміне, Чыжоўскай і часткова ў Гайнаўскай і Бельскай.

— Заблудаўская гміна ўжо па-за абсягам Вашага зацікаўлення?

— Мы яшчэ не ў змозе ахапіць усяго ваяводства, але паволі справа пашыраецца, бо ж выходзяць на свет новыя праекты. Цяпер у Мясцовай групе дзеяння ставім націск на захаванне тых каштоўнасцей для турыстычнага выкарыстання і думаю, што будзем нашу працу пашыраць. Бо каб прыцягнуць да сябе зацікаўленне, людзі мусяць запрапанаваць нешта арыгінальнае.

— Ці, апрача архітэктурных, антрапагенных каштоўнасцей, у полі зацікаўлення Вашай групы былі і іншыя аб'екты, напрыклад, прыродныя?

— Я па адукацыі географ, прыродазнавец і маім першым зацікаўленнем была скарэй прырода, але бачу, што яе нельга аддзяляць ад чалавека, заняцца адной справай, а пакінуць іншую. Тут дзве важныя справы, багацце нашай прыроды і культуры і гэта трэба звязаць з людзьмі, бо без іх не будзе аховы ні аднаго, ні другога. Таму мы рэалізуем шмат праектаў дзеля людзей, дзеля будавання іх культурнай свядомасці. Мы забываем гаварыць па-свойму, людзі несвядомыя, што гэта таксама каштоўнае як і іншыя бытавыя элементы. Пра гэта не гаварылася, разглядалася гэта ў палітычных катэгорыях. А я мяркую, што людзі разумныя і самі змогуць акрэсліць каштоўнасці, толькі ім трэба даць інфармацыю, што і нашы культурна-прыродныя багацці каштоўныя, так як у кашубаў, сілезцаў ці іншых. Гэта не так, што нашы здабыткі архаічныя, што страцілі вартасць, што цывілізацыя вызначае іншыя мэты. Гэта няпраўда, бо ўсе грамадскасці грунтуюць свае пазіцыі. Так дзеецца ўсюды, у Еўрасаюзе, толькі ў нас такі закалот, бо вядома, як у нас справы складваліся.

— А калі гаварыць пра найбольшых саюзнікаў, напрыклад, пра згаданага доктара Маеўскага, то яны, хіба, найдалей ад нас?..

— Так часта бывае, што складана дагаварыцца паміж сабою. А людзі звонку бачаць інакш нашы справы, яны бачаць тую вартасць, якой мы не ўсведамляем, уносяць канструктыўны элемент.

— Можа яшчэ нешта скажаце пра свае іншыя цікавейшыя праекты.

— Мы вядзем зараз каля пяцідзесяці праектаў. Для прыкладу, мы займаліся праектам „Сады на шляху", мэтай якога было вяртанне каштоўнасці традыцыйных відаў пладовых дрэў, значыць, пачаць ахоўваць тыя традыцыйныя сады, якія яшчэ захаваліся.

— А ці многа такіх садоў асталося?

— Пакуль яшчэ крыху асталося: не ўсе садовыя дрэвы яшчэ ўсохлі, усіх яшчэ гаспадары не пассякалі. Вялікіх садоў у нас не было, бывала па некалькі прысядзібных яблынь ці іншых пладовых дрэў. Мо большыя садкі былі ў наваколлі Курашава і там яшчэ крыху тых старых садкоў са старэйшымі сартамі дрэў захавалася. Гэты праект мы рэалізуем супрацоўнічаючы з іншымі суб'ектамі. Хочам у яго рамках разводзіць саджанцы даўніх сартоў, хочам выпусціць невялікі інфарматар пра іх, пра патрэбу іх аховы. І хочам таксама зрабіць улік гэтага матэрыялу на тэрыторыі нашых дзесяці гмін, пабачыць, як гэта зараз выглядае. Хочам нашым агракватэрам стварыць магчымасць паказаць такі сад з традыцыйнымі сартамі. Хочам выпусціць буклет з тапаграфіяй гэтых сартоў, каб турыст мог даведацца дзе можа азнаёміцца з гэтай прапановай, купіць ці пакаштаваць іх. Хочам таксама, каб гэтым відам традыцыі зацікавіць і школы, каб і там можна было знаёміцца з гэтым відам спадчыны. Пачынаем таксама праект датычны традыцыйнага ткацтва; пакуль ён будзе рэалізаваны толькі на тэрыторыі Чыжоўскай гміны і на гэтай аснове хочам стварыць падставу для прапанавання такога мясцовага прадукту. Бо ж яшчэ ў хатах захаваліся старыя ручнікі, капы, адзежа. І на гэтай аснове, на аснове традыцыйнага дызайна прапагандаваць нашы адметныя традыцыі. Колькі ж можна прапанаваць зубра — гэта ўжо пераелася. Праводзім аналіз турыстычных маршрутаў, бо цяпер у гэтай галіне бязладдзе: розныя суб'екты трасіруюць тыя маршруты, значаць іх, а пасля імі ніхто не цікавіцца, няма каму іх абнаўляць. Гэта ўсё неўпарадкавана, па некаторых месцах праведзены па чатыры маршруты, робяць гэта людзі, якія не ведаюць спецыфікі турызму. А я хачу стварыць такі калектыў, які гляне на гэтую праблему сінтэтычна, прынамсі на тэрыторыі гэтых дзесяці гмін, каб прыезджаму турысту падаць цэласную прапанову. Зараз ствараем такі турыстычны сайт для наваколля Белавежскай пушчы з прэзентацыяй мясцовых каштоўнасцей і турыстычнымі ды калятурыстычнымі прапановамі. Хочам упарадкаваць тое, што тут ёсць.

Ёсць і шмат іншых праектаў. Неўзабаве пачнем у нашых гмінах курсы для розных суб'ектаў, як пісаць заяўкі на розныя мерапрыемствы, як карыстацца даступнымі сродкамі. Справа ў тым, каб разбудзіць ініцыятыўнасць, каб людзі самі браліся за справы не чакаючы нейкіх штуршкоў звонку. Каб людзі шукалі тут свой шанс, каб тут зараблялі, каб тут аставаліся.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Да пяцідзесяцігоддзя аб'яднання БЕЛАВЕЖА

Была такая пара...

Размова з ***Аляксандрам Баршчэўскім****, паэтам і беларусістам*

фота Міры ЛУКШЫ

„Ніва": — ***Спадар Аляксандр, Вы трапілі ў „Ніву", пакуль сталі Алесем Барскім, ад самага яе пачатку — як навуковец. Адкрыў Вас таксама Георгій Валкавыцкі. Вы дэбютавалі ў канцы 1958 года, а ўжо ў першым зборніку літаб'яднання „Рунь" апынуліся Вашы спелыя вершы.***

Аляксандр Баршчэўскі: — Я Валкавыцкага памятаю як вельмі парадачнага чалавека, на якога не скажаш кепскага слова. Сам ён паэт, а засакарэчваўся, пісаў пад псеўданімам або крыптонімам, а наперад нас выпіхваў, іншых паэтаў, фаварызаваў нас. Ніколі нікому не зайздросціў, цешыўся, што хтосьці напісаў добры верш. Гэта вялікая рыса сярод аўтараў. Я Юрку Валкавыцкага цаніў і цаню, хаця цяпер кантактаў не ўтрымоўваем, але застаўся для мяне ён чалавекам незвычайным.

— ***Вы, быўшы на стажыроўцы ў Мінску, прыслалі былі ў „Ніву" першы верш... Засакрэціўшыся...***

— Быў ён пад загалоўкам „Вавёрка", наколькі памятаю. Падумаў я, што калі акажацца ён „ерунда", не буду да яго прызнавацца, і падпісаў першы верш псеўданімам. Тым больш, што ў „Ніве" друкаваліся мае тэксты пра літаратуру. Ды ў „Ніве" адказалі, што вершы падабаюцца, спыталіся, хто аўтар. Тады я прызнаўся.

— ***Георгій Валкавыцкі, здаецца, добра адчуваў сваім пушчанскім носам паэтычны дух, трапляў на сапраўды таленавітых аўтараў, якіх згуртаваў вакол „Нівы", якую стварыў і якой шэфствавaў.***

— Праўда. Усіх. Вынаходзіў нас усіх па нашых Бельсках, Гайнаўках, Баравых, Тарнаполях, Ляўковах, Старынах, Бандарах...

— ***Вы часта вяртаецеся ў свае родныя Бандары? У Вашых вершах часта праяўляецца матыў вяртання, мара, каб прайсціся басанож па полі, па прынарваўскіх лугах...***

— Рэдка я бываю ў сваіх Бандарах, але цяпер канчаю мадэрнізацыю хаты.

— ***Пра гэта гаворыць у Бандарах. Была я нядаўна ў Вашых сваякоў, „выцыганіла" ў ніўскі альбом здымак з Вашым цёзкам, былі вы такімі маладзенькімі... На сваёй зямлі.***

— Здаецца, быў той здымак на фоне нейкай хвойкі. Я табе скажу: я, як прафесар, маю гарантаванае месца на варшаўскіх Павонзках. Але я хачу легчы ў сваёй зямлі. Я хачу быць пахаваны разам з бацькамі, з роднымі. Гэта мая зямля, на яе хлебе я выгадаваўся. Не хачу пакоіцца на могілках, дзе мармуры-мармуры...

— ***Не будзем гаварыць пра адыходы... Вы свае мары ажыццяўляеце — ходзіце басанож па бандарскім старонні?***

— Можа і не трэба пра гэта, але ж пара прыходзіць. Можам адысці праз пяць гадоў, праз пяць дзён, або і праз пяць гадзін. Можна спадзявацца ўсяго. І з маладымі людзьмі таксама бывае, як з Міхасём Шаховічам, былым маім студэнтам.

— ***Вы як адчуваеце — Вы здзейсніліся як навуковец, ці як паэт? Кім Вы больш?***

— Чалавек не здзяйсняецца да канца. Не заўжды чалавек задаволены тым, што зрабіў, і мог бы зрабіць яшчэ больш. Праўда, бываюць такія, што ганарацца зробленым, не прыкмячаюць сваіх памылак. Мне здаецца, што мною зроблена менш, чым магло б. Дарэчы, я чалавек лянівы...

— ***??? А ў чым тая Ваша „лянота"?***

— Калі няма нажа на горле, дык не возьмешся... Усё што сёння зрабіць трэба — на заўтра! Гэта тыповая беларуская рыса.

— ***І ў паэзіі таксама? Там жа ловіш хвіліну, а яе не змераеш, не перасунеш на заўтра ці на пасляпасляўтра!***

— У паэзіі таксама.

— ***А калі прыходзіць натхненне?..***

— Не прыходзіць.

— ***Не бывае такога чагосьці як натхненне?***

— Бывала. Найшло яно на мяне, вось, тады, калі я паехаў адпачываць пад Мінск, у Іслач. Я там пісаў кожны дзень парадкам па дваццаць вершаў. Але гэта быў адзіны такі „парыў".

— ***Можа, месца гэта выклікала? Ягоны дух?***

— Не ведаю, ці тое месца было нейкае паэтычнае. Калі я там пачуў, як усе беларускія пісьменнікі, якія разам там адпачывалі, размаўляюць выключна па-руску, то не ведаю, ці гэта магло навесці на мяне лірычны настрой. Але была такая пара... А вось цяпер я адчуваю страшэнна хуткі бег часу. Ніхто не думае пра тое, што памрэм.. А ці той свет існуе, ці не, мы не ведаем. У кожным выпадку жыць чалавеку кожнаму хочацца. Нават найбольш веруючы, і хто чэсна жыў, невядома ці трапіць у рай. Ці ў тое пекла. Хоць маленькае тое пекла якое б не было, але кожны хоча быць у сваім... А ваш муж гжэчны? А што ў Гандзі Кандрацюк, маёй студэнткі? Маеце яе новую кніжку? Вельмі самастойная студэнтка была. Хацела працу пісаць тарашкевіцай!

— ***Гандзя таксама дэбютавала ў „Ніве" вершамі, як, дарэчы, і гісторык Яўген Вапа, амаль, у адзін час яны ўзяліся за пяро. Паэтычныя ў нас усіх пачаткі, паэтычны народ... Хоць жыццё не скажаш што зусім паэтычнае...***

— ... А што ў Валодзі Гайдука? Цяжкае меў хлопец жыццё... Будзе яму з 66 гадоў. Былі ў яго ў Тарнопалі?

— ***Былі мы ў яго з Гандзяй. Настрой у яго ненайлепшы...***

— Ён заўжды быў песімістам. Поўным жалю. Гэта давала яго паэзіі нейкі прысмак... „Белавежа" яму даўно кнігі не выдавала. Можа, „Ніва" паможа?.. А Ада піша? А Геня з Новай Волі працуе? На пенсію выбіраецца? А Марыся? Не працуе? Расчытвала мае рукапісы! А няўрымслівы Шурык Вярбіцкі? А што ў Надзі? Піша? Даўно яе бачылі?..

— ***О, усіх памятаеце! Зараз я Вам усё парасказваю, што ў каго. Але вернемся да пытанняў да Вас: ці ў Вас пішуцца вершы? Вашы памятныя вершы пра каханне, якое рухае ўсім светам, жарснае, кіпучае! Хто ж лепш з усіх „белавежцаў" напісаў пра гэта! А Вы, як усё ж такі навуковец, нават пералічвалі ўсе яго прыкметы: сорак пятая, сто дзесятая... Вы больш як паэт, ці навуковец?***

— Калі б хто мяне разбудзіў сярод ночы і спытаўся, хто я — навуковец, паэт, публіцыст — я сказаў бы адразу: мужык!.. З Бандароў. А, быў час, калі я пісаў пра каханне...

— ***А што, таго часу ўжо няма?***

— Ну, Божа мой, што там гаварыць! Мой час скончыўся.

— ***Эгэ... І больш нямаш вершаў, а тым больш пра каханне?***

— Ужо не з такім размахам, як было калісь.

— ***Гаворка пра каханне, ці пра вершы?***

— Пра каханне ў вершах. Ловіш гэта?

— ***Мы ж амаль з аднае вёскі! З таго боку. Мы на Вас кажам „зарэчанскія".***

— А мы так кажам пра вас. Але я ў вашай вёсцы ніколі не быў. У Масеве быў, а не заехаў у Баравыя.

— ***Ну дык што з тымі вершамі? Ці пішуцца і будуць пісацца вершы?***

— Я свядома абмяжоўваю сябе, свае паэтычныя „запэнды". Свядома. Перастаў верыць у місію паэзіі. Не, гэта не шок. Перастаў верыць у місію паэзіі і не ведаю, каму яна патрэбная. Ці вы ведаеце людзей нармальных, сярод, скажам, навуковых прафесій, якія б захапляліся паэзіяй? Ну, няма. Так, паэзіяй пераймаліся вучні, сяляне, стараліся пісаць вершы. Сёння наступае смерць паэзіі. Не толькі ў нас. Польскія паэты, у амаль саракамільённым народзе, выдаюць зборнікі па 150 экземпляраў! Цяжка паверыць, што зноў народзіцца ідэя рамантычная, вера ў місію паэзіі, захапленне ёю. Мне здаецца, што да гэтага ўжо не дойдзе.

— ***Ды ж заўсёды гаварылася, што на нашай прынарваўскай тэрыторыі ў кожнай гміне вырастае прынамсі па двух паэтаў.***

— Ну, у Бандарах, апрача мяне і таго другога сімвалічнага Аляксандра Баршчэўскага быў яшчэ празаік Васіль Баршчэўскі і дзядзька Федар з Рыбакоў. Памерлі ўжо і Васіль, і Федар...

— ***Прапушчаныя месцы напаўняюцца. Насупраць хаты дзядзькі Федара жыве Марыся Хлябіч, якая паказала свае вершы...***

— А, жонка Аляксандра Хлябіча. Яна парадачная вельмі кабета. Гэта ж мае далёкія сваякі. Яе бацька быў заўсёды беларус. Перад вайной падпісваўся на беларускія часопісы. І муж Марысі шчыры, начытаны чалавек, мае вялікую бібліятэку. Я рады, што вы адкрылі тое, што Марыся Хлябіч піша. А што чуваць у „Ніве"? Як адчувае сябе Ада? І ў мяне быў інсульт...

— ***Славутыя былі Вашы вершы пра каханне, бо ж на каханні стаіць свет. А ж чытачы чакаюць Вашых тэкстаў, пытаюцца, ці піша Баршчэўскі. Памятаюць Вашы фельетоны „На мяжы", развагі „Радзіма — родзіна".***

— Сёння ніхто не заахвочвае...

— ***Як — не заахвочвае? Самі добра ведаеце, што найважнейшы — чытач.***

— Праўда, многія людзі пыталіся ў мяне, калі будзе наступны адрэзак. Раз спаткаў чалавека з Лукі, які сказаў мне: «Калі я прыязджаю з поля, кідаю ўсе справы калі прыйдзе „Ніва", і чытаю, а жонка аж злуецца, што займаюся „чапухою", калі работы яшчэ столькі!» Калісьці мой фельетон друкаваўся штотыдзень, пасля што два тыдні, пасля што тры...

— ***Гэта ж не знеахвочванне аўтара было, а проста, мабыць, не было ў рэдакцыі Марысі Федарук, якая адна магла дакладна расшыфраваць Вашы рукапісы!.. Чакаем абавязкова і з радасцю прадставім чытам Вашы развагі.***

— У такім выпадку паможа мне Ніна Баршчэўская і фельетон перадаць у чытабельнай форме. Перадайце прывітанні ўсім ніўцам ды паклон бацюшку Міколу Шабеляну ў Семяноўцы. Маю такую думку, што калі б я памёр, каб якраз ён мяне праводзіў на той свет.

— ***Давайце не будзем думаць аж пра такія канчатковыя справы, а больш пра вясну, паэзію, каханне... Дзякуем за размову!***

Размаўляла Міра ЛУКША

З гаспадаркі можна жыць...

Тэкст і фота
Уладзіміра СІДАРУКА

У Чаромхаўскай гміне Чаромха-Вёска лічыцца адным з большых салэцтваў і ад Чаромхі-Станцыі раздзяляе яе не больш чым паўкіламетровы прамежак. Гэта сучасная вёска з перспектывай на далейшае развіццё. Шыкарныя забудовы, асфальтавая вуліца, пажарнае дэпо са святліцай, пункт скупкі малака, аўтазаправачная станцыя, мяняльная кантора і некалькі крамаў больш нагадваюць пасёлак чым вёску. Гэты прагрэс жыхары абавязаны перад усім таму, што вёска знаходзіцца непадалёк чыгуначнай станцыі і краёвай дарогі з Беластока да пагранперахода Полаўцы — Пяшчатка, якая зараз ад Кляшчэляў праходзіць значную мадэрнізацыю (дзеля гэтага была тут пабудавана аўтазаправачная станцыя, мяняльная кантора і дзве мясныя крамы). Асноўнай крыніцай даходу чарамшан даўней была чыгунка, гаспадарка лічылася другараднай справай. Трэба адзначыць, што зямля тут ненайгоршай якасці і ў сучаснай рэчаіснасці, зважыўшы на еўрасаюзныя даплаты, можна разлічваць на прыбытак. А вось гэтаму доказ.

Віктару Іванюку 40 год. Працуе ён рабочым на гміннай ачышчальні сцёкаў і займаецца жывёлагадоўляй. Апрацоўвае ён каля дваццаці гектараў поля. Палову таго, у пераважнай большасці зялёных угоддзяў, арандуе на пашу для жывёлы.

Віктар Іванюк у кароўніку

На пасевы прызначае не больш чым паўтара гектара. Засявае поле жытам, трыцікале ды іншымі збожжавымі сумесямі. У яго сем дойных кароў і чатыры штукі маладняку (тры бычкі і ялошка). У перспектыве хоча пабольшаць статак да дзесяці штук. Мае ладны дом, два трактары (айчынная „шасцідзесятка" і „Уладзімірац"), неабходныя сельскагаспадарчыя машыны і аптымістычна спаглядае на свет...

— Шэсць год таму увольнілі мяне з работы і я стаў беспрацоўным. Сям'я засталася без крыніцы даходу. У бацькі папраўдзе была больш чым дзесяцігектаровая гаспадарка і тры каровы, але ледзь зводзілі мы канцы з канцамі. Прыбытку не было ніякага. Рашыў я ўзяць ініцыятыву ў свае рукі. Купіў я дзве дойныя каровы. Складавае памяшканне, якое думаў прызначыць на гараж для прычэпа-падборшчыка, прыспасобіў на абору. Неўзабаве ўладкаваўся я на працу ў гміннай ачышчальні сцёкаў. Быт нашай сям'і палепшыўся, калі сталі мы здаваць на скупку малако і пакарысталіся еўрасаюзнымі даплатамі. У мінулым годзе, напрыклад, ад пяці кароў у сезоне штодзень пастаўлялі мы па сто дваццаць літраў малака і атрымалівалі за гэта каля трох тысяч злотых прыбытку. Атрымаў я восем тысяч злотых даплаты за агульную плошчу пасеваў і зялёных угоддзяў ды дванаццаць тысяч на пабудову гнаявой пліты, якую сам зрабіў, толькі спецыяльны цэментны раствор прывозіў з Беластока. Ніхто ў гміне такой плітой не карыстаецца.

— Як удаецца Табе спалучаць прафесійную работу з працай на гаспадарцы? Ці знаходзіш час на адпачынак?

— Практычна аб гэтым не думаю, — гаворыць Віктар. — Мой рабочы дзень пачынаецца са світання і канчаецца познім вечарам. Вялікім памочнікам з'яўляецца мне механізацыя. Усё практычна на месцы. Корм змешчаны ў сумежным з кароўнікам гумне. Зрабіў я аўтаматычныя паілкі для кароў, карыстаюся электрычным даільным апаратам, а гной на пліту выкідваю пры дапамозе стужкавага канвеера. Ранкам і ўвечары даглядаем жывёлу пры электрычным асвятленні. Жонка ў мяне не складае рук. Кожну хвіліну (а даглядае яшчэ шасцярых дзетак дашкольнага і школьнага ўзросту) прызначае на догляд сямейнай гаспадаркі.

— Ці зараз можна выжыць з гаспадаркі?

— Цяжка прыходзіцца, — канстатуе суразмоўца. — Мне, каб не аклад гміннага рабочага, тады хоць у трубу лезь. Надта высокія кошты рамонту сельскагаспадарчых машын і прылад ды інвестыцыі паглынаюць амаль увесь прыбытак ад вытворчасці. Паратунак бачу ў еўрасаюзных даплатах, якія магу прызначыць на мадэрнізацыю гаспадаркі і інвестыцыі.

— Якія затым планы на будучыню?

— У перспектыве хачу павялічыць статак да дзесяці дойных кароў, увольніцца з дзяржаўнай пасады рабочага на ачышчальні і заняцца адно жывёлагадоўляй. Тады лічу на станоўчы вынік сваёй гаспадаркі. А сёлета хачу пакрыць дом бляхай...

— Жадаю затым поспехаў.



Нягледзячы на непрыхільнае стаўленне да беларускай мовы ў сучаснай Беларусі і практычна суцэльную русіфікацыю, на глебе беларускай літаратуры там-сям усё ж такі з'яўляюцца цікавыя парасткі. Найбольш прагрэсіўная моладзь, па ўсім відаць, разумее, што ўласная беларуская мова і літаратура можа выдатна канкураваць з рускай у данясенні свайго светапогляду. Адным з прыкладаў такога стаўлення можна назваць творчаць маладога літаратара Сяргея Балахонава. Каб больш дэтальна пазнаёміцца з ёй, варта зазірнуць на сайт **http://balachonau.puls.by.**

Назва сайта з пачатку падаецца не зусім зразумелай — „Тэзэй беларускага постмадэрнізму". Вядома, што Тэзэй — гэта старажытнагрэчаскі герой, сын афінскага цара Эгея. Ён забіў Мінатаўра, зрабіў Афіны цэнтрам краіны, заснаваў антычную дзяржаву, перамог амазонак і спусціўся ў падземны свет, каб скрасці Персефону. У рэшце рэшт цар Лікамед Скіроскі кінуў яго ў мора.

Пэўна, слава старажытнага Тэзэя вабіць Сяргея Балахонава, таму ён знаходзіць у сваёй творчасці рысы нечага гераічнага. Магчыма, нешта ў гэтым ёсць, зважаўшы на тое, што ў цяперашні час літаратарствам па-беларуску займаецца не надта вялікая колькасць аматараў пяра.

Але ж вернемся да сайта. Зроблены ён страката. З аднаго боку зразумела, што ягоныя распрацоўшчыкі імкнуліся як мага больш укласці інфармацыі ў невялікую прастору, але, мяркую, трэба было неяк пашырыць выяўленне, не сціскаючы яго.

Што ж тычыцца інфармацыі на сайце, то яна вартая таго, каб з ёю азнаёміцца. І пачаць трэба з невялікай нататкі „Уласна Тэзэй". Тут вельмі падрабязна распавядаецца, што ўяўляе з сябе пісьменнік Сяргей Балахонаў. „Нарадзіўся 24 красавіка 1977 г. у Гомелі (афіцыйна, а насамрэч у вёсцы Сьвяцілавічы Веткаўскага раёну). Скончыў гомельскую сярэднюю школу № 49 з паглыбленым вывучэньнем нямецкае мовы (1994), гістарычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту (1999). Ад таго часу настаўнічае (зь перапынкам на службу ў войску (2000)). Жыве пераважна ў Гомелі. Халасты. Сталая літаратурная творчасьць пачалася ў 1992 годзе. Аднак усе творы, напісаныя да восені 1998 году, нідзе не публікаваліся. Сярод іх вершаваныя зборнікі «Сонцавароты», «Брама сталасьці», «Мой беларускі...», «Дваццатае вока вясны», «Паляваньне на тэкст», няскончаныя эпічныя паэмы «Прывітаньне, мая каханая» ды «Алесь Гальшэўскі», некалькі фантастычных апавяданьняў ды аповесьць «Іх спаткала нявосень». Першыя публікацыі зьявіліся ўвосень 1998 году ў самвыдаце «Сымболь» і адначасна ў газэтах «Наша слова» і «Наша Ніва»".

Творы Сяргея Балахонава мы знойдзем у рубрыках „Проза" і „Рыфма". Асабліва цікава, мяркую, будзе пазнаёміцца з перакладамі, якія рабіў Сяргей. Многія з іх маюць арыгіналам песні расійскіх папсовых гуртоў і выканаўцаў.

Сярод мноства іншых рубрык, якія распавядаюць пра літаратурныя захапленні аўтара, мы можам пабачыць ягоныя здымкі (старонка „Выявы"), а таксама пазнаёміцца з анекдотамі пра пісьменніка. Каб прачытаць іх, трэба зайсці ў рубрыку „Любоў народная" і адкрыць падрубрыку „Показкі".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Насычаны сакавік

Камандай месяца ў мужчын можна назваць зборную шаблістаў (Дзмітрый Лапкес, Аляксандр Буйкевіч, Валерый Прыёмка), якая заняла трэцяе месца на этапе Кубка свету ў балгарскім Плоўдзіве, а потым у Алжыры выйграла этап і заваявала права выступаць дружынай на алімпіядзе. Адзначым і зборную Беларусі па міні-футболе — яна другі раз у гісторыі прабілася ў плэй-оф чэмпіянату свету. У жанчын безумоўны лаўрэат — эстафетны квартэт па бегу (4 па 400 метраў) — сярэбраны прызёр першынства Еўропы ў залах. А на велатрэку нашы дзяўчаты занялі 4-е месца ў камандавым пераследзе на 3 км. Не забракла і індывідуальных поспехаў, пра якія ніжэй. Асабліва парадавалі беларускія хлопцы, так што давялося пашырыць спіс намінантаў.

1. Аляксандр Лісоўскі (велатрэк) прыехаў на чэмпіянат свету ў брытанскі Манчэстэр „цёмным конікам" і ў першы ж дзень здзейсніў сапраўдную сенсацыю, выйграўшы скрэтч (гонка з адным фінішам і без прэмій) на 15 кіламетраў. Брава, новы чэмпіён! Але гэта яшчэ не ўсё. У апошні дзень спаборніцтваў Лісоўскі стаў яшчэ бронзавым прызёрам у омніуме (комплексная праграма з пяці відаў, якая патрабуе універсальнасці).

2. Васіль Кірыенка (велатрэк) стаў чэмпіёнам у алімпійскай дысцыпліне — калектыўнай гонцы па ачках. У гэтым відзе вялікая група ганяецца па трэку і кожны імкнецца на прамежкавых адрэзках набіраць ачкі. Захапіўшы лідэрства з самага пачатку, Кірыенка ў выніку на адзін бал апярэдзіў другога прызёра. А зборная Беларусі па выніках чэмпіянату заняла трэцяе месца па вартасці медалёў пасля Вялікабрытаніі і Нідэрландаў.

3. Дзмітрый Шакута (тайскі бокс) у Нідэрландах, упэўнена перамогшы ў трох паядынках, стаў абсалютным чэмпіёнам сярод прафесіяналаў! За тытул змагаліся восем мацнейшых байцоў, спрэс чэмпіёны свету і Еўропы, адбор якіх да турніру ішоў два гады.

4. Андрэй Краўчанка (лёгкая атлетыка) стаў сярэбраным прызёрам чэмпіянату свету ў залах, усталяваўшы прытым рэкорд Беларусі ў сямібор'і.

5. Вадзім Каптур і Аляксандр Варламаў (скачкі ў ваду) сталі другімі на першынстве кантынента па сінхронных скоках з 10-метровай платформы.

6. Уладзімір Самсонаў (настольны тэніс) трэці раз у сваёй кар'еры перамог трох кітайскіх зорак і выйграў адкрыты чэмпіянат Кувейта.

1. Святлана Хахлова (плаванне) заваявала бронзавы медаль чэмпіянату Еўропы. У фінальным заплыве на 50 метраў батэрфляем (у гэтай дысцыпліне спабаравалі ажно 47 удзельніц!) беларуска паказала час 26,52 секунды — новы нацыянальны рэкорд.

2. Надзея Астапчук (лёгкая атлетыка) дасягнула срэбра на чэмпіянаце свету ў залах у штурханні ядра.

3. Іна Жукава (мастацкая гімнастыка) спярша на этапе Гран-пры ў Маскве ўзяла тры ўзнагароды (дзве бронзы плюс срэбра). А на наступным турніры ў Францыі заняла 2-е месца ў асабістым шматбор'і.

4. Аляксандра Герасіменя (плаванне) засталася на першынстве Еўропы без медалёў, але заняла высокія 4-е і 6-е месцы.

5. Вольга Гаварцова (тэніс) выйшла ў фінал турніру ВТА.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Як далей нам тут жыць?

Дзяржаўная статыстыка паказвае, што нашмат палепшала жыццё ў нашай краіне, таму што ўзрос валавы прадукт за мінулы год і хутка папраўляецца дабрабыт жыцця. На маю думку ўсё тое, што паказвае статыстыка, з'яўляецца хлуснёй. Магу як прыклад прывесці маю сям'ю. Я атрымліваў пенсіі 625,93 зл., а ў сакавіку далі мне з кампенсацыяй 666,91 зл. Гэта значыць, што павялічылі мне пенсію на 40,38 зл. у месяц. Жончына пенсія налічвала 540,38 зл. у месяц, цяпер будзе гэта 565,38 зл. — з кампенсацыяй 25 злотых! Ці ў мяне і ў маёй жонкі іншыя страўнікі чым у тых пенсіянераў, у якіх пенсіі ў пару разоў большыя ад сялянскай ды атрымалі яны нашмат большыя кампенсацыі? Ці пенсіянеры-сяляне гэта людзі, якім манна нябесная сыплецца ў гаршкі? Яны ж цяжка працавалі, без выхадных дзён ды святаў, а былі вымушаны даваць дзяржаве „прэдналог", даніну за марныя грошы, здаваць мяса, збожжа, бульбу, малако, плаціць падатак за сваю зямлю...

Калі цяпер паслухаеш тэлебачанне ці радыё, то пачуеш толькі аб страйках. Страйкавалі настаўнікі — павялічылі ім зарплаты. Страйкавалі лекары — адваявалі сваё. Страйкуюць медсёстры і ніжэйшы белы персанал; некаторыя патрабуюць павялічэння зарплаты на 300-600 зл. Пачынаюць страйкаваць дзяржаўная і самаўрадавая адміністрацыя, паліцыя і ўсе мундзірныя службы і відаць, што хто страйкам дамагаецца, таму ўрад павялічвае зарплату. А як маюць страйкаваць пенсіянеры, калі ім цяжка нават выйсці з хаты на свежае паветра, а што казаць, каб такому дабраца ў горад ці да лекара ды і нямаш на чым, бо аўтобусы адмянілі, а пешшу трэба было б клыпаць з чатыры кіламетры! Не зойдзеш! І так сядзіш ціха ў сваёй хаце, а калі аб'язная крама прывязе тавар у вёску, то некаторыя прадаўцы той тавар прадаюць на 100 працэнтаў даражэй. І ніхто за гэтым не сочыць.

Асабліва тут, на ўсходняй сцяне, нас дыскрымінуюць.

Падумайце сур'ёзна, дзяржаўныя ўлады, аблягчыце нам жыццё ў нашай восені!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Сацыяльная дапамога

У гмінах матэрыяльным забеспячэннем маламаёмных грамадзян займаюцца гмінныя асяродкі сацыяльнай дапамогі (ГАСД). Рэалізуюць яны задачы ўласныя, як і даручаныя. Вось як гэта адбываецца ў Чаромхаўскай гміне.

— Сёлета на сямейныя павіннасці прызначана 871 тысячу зл., — гаворыць Марыя Зіневіч, кіраўнік ГАСД. — Гэта даручаная гміне задача. Тычыцца яна аліментацыйнага авансу, грашовай дапамогі за догляд, як і складчыны ЗУС. Прыняты ў гэтай справе 232 рашэнні, у гэтым ліку датычныя аліментацыйнага задатку — 21, платы за догляд — 96 і грашовай дапамогі для маці інвалідных з нараджэння дзетак — 3. Сталай успамогай карыстаецца дванаццаць падапечных. Сёлета на гэтую мэту прызначана 40 тыс. зл. Паводле крытэрыяў павіннасць належыцца тым, хто дасягнуў пенсійнага ўзросту, не карыстаецца пенсіяй ЗУС, а на аснове рашэння лекара Павятовага цэнтра дапамогі сям'і лічыцца непрацаздольным. Сума выплаты залежыць ад даходу сям'і (не павінен ён перавышаць суму 444 зл. на душу).

— Апрача сталай успамогі, — працягвае субяседніца, — выплачваем як часовыя, так і аднаразовыя павіннасці. У першым выпадку на дамогу могуць разлічваць сем'і, якія знаходзяцца ў цяжкіх фінансавых і жыццёвых умовах. Гміна на гэтую мэту прызначыла 150 тыс. зл. (дагэтуль выдала 32 рашэнні). Калі гаварыць пра аднаразовую грашовую дапамогу, то невялікія сумы прызначаюцца на закупку харчоў, адзення, паліва ці лякарстваў. У мінулым годзе гэтай дабрадзейнасцю пакарысталася 340 жыхароў гміны, сёлета — 68. Нягледзячы на крытэрыі, гміна неаднойчы адступае (на аснове закону, зразумела) ад агульнапрынятых прынцыпаў і прызначае грашовую дапамогу пацярпеўшым у нешчаслівых выпадках. У мінулым годзе было выдадзена 10 такіх рашэнняў, сёлета — 3. Варта адзначыць, што гмінны самаўрад штогод прызначае грошы на падкормліванне вучняў у школе. Каб пакарыстацца бясплатным харчаваннем, трэба каб месячны даход у сям'і вучня не перавышаў 526,50 зл. (нета), а ў выпадку самастойнай адзінкі гаспадаркі — 715,50 зл. У пачатковай школе падкормліваннем сёлета пакарысталася 78 вучняў, а ў гімназіі — 41. Апрача таго гміна нясе кошты дадатковага харчавання для 31 дзіцяці ў прадшколлі і 8 вучняў звышліцэйскіх школ. Кошт абеду ў пачатковай школе складае суму 2,5 зл., у прадшколлі — 3,2 зл. , а ў звышліцэйскіх школах — не больш чым 3,5 зл.

(ус)

БЕЗ БОГА НІ ДА ПАРОГА

Надаўна ў царкве я чула, як бацюшка на казані гаварыў, што без Божай благадаці мы не ў змозе нічога зрабіць. Нават дабро, якое робім іншым людзям, можа абярнуцца процію нас злом...

Хтосьці чытаючы мае допісы можа сказаць, што я зрабілася сантыментальнай святошай і паўтараю толькі тое, што бацюшка сказаў, ды гэта не так. У гэтых словах ёсць праўда і падстава для разваг. Пры „камуне", якую так цяпер аплёўваюць, небагатым людзям жылося няблага. Працавалі, іх дзеці вучыліся. Хто скончыў прафесійную школу, хто сярэднюю, а хто нават і універсітэт. Працы ўсім хапала. Памятаю, як бацькі страшылі нас, хто не хацеў вучыцца: „Будзеш вуліцу падмятаць або ў тартаку дошкі цягаць, або гараваць на гектарах!" Цяпер цяжка атрымаць працу нават пры прыбіранні вуліцы, не гаварыўшы ўжо аб нейкім прадпрыемстве. Гаспадарам таксама цяжка прадаць свае вырабы. Дабіваюць яшчэ і цэны. Хто жыве як кароль, а іншаму і на хлеб не хапае! Чыноўнікам ды ўраднікам, дэпутатам усялякім ды розным прэзасам бяда нястрашная. А колькі ўжо людзей з'ехала за мяжу, а там — як каму трапіцца, можа і марна загінуць. Цяпер міністр прапануе, каб уласнікі малых прадпрыемстваў не плацілі страхавой складчыны за работніка, не мелі абавязку назначаць часу працы, мелі права звольніць работніка перад пенсіяй, не мелі абавязку аховы цяжарных жанчын... Не дай Бог, калі б такое ажыццявілася — жылося б нам горш чым у паншчыну! Хай той міністр і моліцца, дык не мае ён Бога ў сэрцы!

Камуністы адкідалі былі веру ў Бога і блага адносіліся да тых, хто ў Яго верыў, бо меркавалі, што цары і духоўнікі спецыяльна трымалі народ у цемры. Цяжка было нашым продкам жыць у мінулым. Шмат жанчын умірала пры родах, многа немаўлят пайшло на той свет. Дзецям беднякоў было не да навукі, бо і грошай бацькі не мелі, змалку мусілі цяжка працаваць. Ледзь хапала на кавалак хлеба і зрэбную кашулю. Камуністы хацелі змяніць свет, каб быў лепшы паводле іх меркаванняў. Ды без Божай благадаці чалавечыя планы, нават найлепшыя, абернуцца ў нішто.

АЎРОРА

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — азербайджанскую прыказку.

1. дакумент патрэбны для перасячэння мяжы = 10 _ 53 _ 42 _ 35 _;
2. няпрошаны горшы за татарына = 17 _ 21 _ 14 _ 15 _16 _;
3. імя Мантана, французскага спевака і акцёра (1921-91) = 18 _ 12 _;
4. порт на ўкраінскім беразе Дуная = 24 _ 25 _ 32 _ 33 _ 29 _;
5. халтурны выяўленчы твор = 27 _ 28 _ 34 _;
6. дзяржава з Трыпалі = 8 _ 7 _ 43 _ 44 _ 3 _;
7. дах на слупах для засцярогі ад дажджу = 47 _ 48 _ 30 _ 31 _ 37 _ 38 _;
8. фаза з бачным цэлым дыскам Месяца = 39 _ 40 _ 51 _ 52 _ 26 _;
9. гарадскі пасёлак у Ваўкавыскім раёне над аднайменнай рэчкай = 4 _ 5 _ 2 _ 9 _;
10. паўночная прамысловая рыба сямейства ласасёвых = 19 _ 46 _ 45 _;
11. трохэлектродная электронная лямпа = 20 _ 22 _ 23 _ 13 _ 41 _;
12. „вертыкальная" паўднёваамерыканская дзяржава = 54 _ 55 _ 49 _ 1 _;
13. Іосіф, беларускі юрыст і прававед (1921-2007) = 36 _ 56 _ 11 _;
14. атрута = 50 _ 6 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 9 нумара

Хрэн, фараон, Ірландыя, сын, Ліван, барыкада, маіс, выява, аманал.

Рашэнне:

Дрэнныя навіны — маланкавыя.

Кніжную ўзнагароду высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: II kwartał 26 zł. do 5 marca 2008 r; III kwartał 26 zł. do 5 czerwca 2008 r.; IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. II półrocze 52 zł. do 5 czerwca 2008 r. II — IV kwartał 78 zł. do 5 marca 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.
Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52. **Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł. **Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Nakład: 1 740 egz.

Прыйдзе час і ўсё на дзяржаўным роўні будзе названа сваімі імёнамі, бо „паўлічэнкі", „навумавы" і „лукашэнкі" не вечныя. А ідэалы Беларускай Народнай Рэспублікі будуць жыць, пакуль будзе жыць беларуская ідэя...

Дзень Волі пад акупацыяй

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

www.nn.by

Улада, якая зараз пануе ў Беларусі, не дала беларусам спакойна адзначыць найвялікшае нацыянальнае свята — 90-ыя ўгодкі з дня абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Грамадзяне краіны мірна і годна збіраліся адсвяткаваць гэтую юбілейную дату, якая сімвалізуе адраджэнне беларускай дзяржаўнасці. Было запланавана ўрачыстае шэсце па вуліцах сталіцы і ўскладанне кветак да помнікаў беларускім паэтам — Якубу Коласу, Янку Купалу, Максіму Багдановічу. Здзейсніць задуманае не ўдалося. Улада чарговы раз прадэманстравала грубую фізічную сілу на мяжы з садызмам. Такая ўжо ў яе прырода; іншых якасцей, акрамя памкнення татальна душыць праявы беларускага патрыятызму, у яе папросту няма.

25 сакавіка Мінск сустрэў мокрым снегам. Зазвычай на дзень Звяставання па грыгарыянскім календары заўсёды стаіць добрае сонечнае надвор'е. На гэты раз было па-іншаму. Сапраўдная прыродная слата накрыла беларускую сталіцу з самага ранку. Напярэдадні і 25-га па ўсёй краіне адбылася вялікая колькасць дарожна-транспартных здарэнняў, у выніку якіх загінула шмат людзей, у тым ліку высокапастаўленых асоб. У прыватнасці разбіліся насмерць намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама і дырэктар бабруйскага прадпрыемства „Белшына". У Мінску ад раніцы панаваў паўзмрок, атмасфера была гнятлівая ў прамым і пераносным сэнсе.

Збор грамадзян на шэсце быў прызначаны на шостую гадзіну вечара на пляцы Якуба Коласа. Аднак, ужо за гадзіну доступ туды быў наглуха перакрыты — цягнікі метро і аўтобусы не спыняліся, а сама плошча па ўсім перыметры была абгароджана металёвымі турнікетамі і ачэплена шэрагамі міліцыянтаў. Без дзесяці шэсць падыходжу да пляцу з боку Камароўскага рынка. Усе падыходы зачынены, а людзей, якія спяшаюцца — хто з працы дамоў, хто ў садок забраць дзіця, скіроўваюць назад. Людзі абураюцца, некаторыя досыць гучна пачынаюць сварыцца з міліцыянтамі, але стражы „правапарадку" стаяць непахісна. Усё гэта вельмі нагадвае каменданцкую гадзіну, нейкае ваеннае становішча ў абсалютна мірны час. Да дзядзькі Якуба (помніка Коласу) нікога не пускаюць. Тыя, хто прыйшоў на свята, у пэўнай разгубленасці. Урэшце многія абыходнымі шляхамі, хлюпаючы нагамі па снежнай кашы, скіроўваюцца да Акадэміі Навук. На падыходзе туды здалёк бачныя бел-чырвона-белыя сцягі.

На прыступках будынка Акадэміі Навук і ніжэй збіраецца каля трох тысяч чалавек. Лунаюць сцягі, узнятыя таксама расцяжкі „Свабоду Казуліну". Каля паловы на сёмую Мікола Статкевіч пачынае мітынг. За ім у мегафон прамаўляюць іншыя палітычныя дзеячы — Вячаслаў Сіўчык, Павал Севярынец... Паблізу знаходзяцца вядомыя ў Беларусі асобы, якія прыйшлі на свята — Генадзь Бураўкін, Станіслаў Шушкевіч, Валерый Шчукін... Наўкола таўкуцца людзі ў цывільным, якія заўсёды лёгка пазнавальныя па вачах і гутарцы. Навошта толькі ім перапранацца? Цэлы час валіць густы снег. Пачынае хутка цямнець. Становіцца вядома, што значная частка людзей, якая ішла з боку станцыі метро Плошча Перамогі, не можа трапіць на месца мітынгу. У мегафон абвяшчаюць, што там адбываюцца сутыкненні і затрыманні. Толькі пазней тыя, хто быў ля Акадэміі Навук, даведаюцца пра брутальныя дзеянні міліцыі і збіванні.

www.nn.by

З усіх пазнейшых інфармацый выразна вынікае — затрымлівалі і білі спланавана, пераважна па загадзя складзеным спісе. У першую чаргу моладзевых лідэраў, якіх уладзе аніяк не ўдаецца скарыць нават крымінальнымі справамі.

Выступоўцы змяняюць адзін аднаго, падыходзяць кіраўнікі Беларускага народнага фронту Лявон Баршчэўскі і Вінцук Вячорка, прамовы якіх як заўсёды моцныя. Людзі спяваюць гімн „Магутны Божа" і скандуюць „Жыве Беларусь!". Але неўзабаве становіцца зразумела, што мітынг сябе вычарпаў. Прайсці па запланаваным маршруце папросту немагчыма, пляц Якуба Коласа па-ранейшаму шчыльна ачэплены з усіх бакоў. Па праспекце пачынаюць ездзіць машыны з адмысловымі гучнікамі. Міліцыянты па-расейску патрабуюць разыходзіцца і пагражаюць прымяненнем сілы і спецыяльных сродкаў. Моладзь расцягвае вялікае бел-чырвона-белае палотнішча. Настойлівыя патрабаванні ад міліцыі ісці на плошчу Бангалор, дзе мітынг, маўляў, дазволены, ніхто выконваць не збіраецца. Сапраўды ісці на аддалены цёмны „сабачнік" — гэта значыць зусім не паважаць сябе. Частка прысутных пераходзіць ад будынка на ходнікі. Яшчэ хвілін пятнаццаць моладзь ходзіць са сцягамі туды-сюды ўздоўж праспекта. Калі калона дэманстрантаў спрабуе зрушыцца ў цэнтр горада, ім перагароджваюць дарогу амапаўцы ў шлемах і браняваныя грузавікі. Урэшце людзі пачынаюць разыходзіцца...

Пазней стала вядома, што па розных даных было затрымана ад 80 да 100 чалавек. З той часткі дэманстрантаў, якія памкнуліся прайсці ад плошчы Перамогі на Кастрычніцкую плошчу, многія былі моцна збітыя. Па сведчанні многіх, людзі апынуліся заціснутымі ў кола. Азвярэлыя „ахоўнікі парадку" ў чорнай злавеснай вопратцы з лютай жорсткасцю накідваліся на суграмадзян, білі журналістам апаратуру, крычалі матам у самым цэнтры беларускай сталіцы. Як назваць такіх вырадкаў, якіх выгадавала і як сабак нацкоўвае на мірных людзей сённяшняя ўлада ў Беларусі? Як назваць такую ўладу? Інакш як антынароднай і акупацыйнай яе нельга назваць!

Прыйдзе час і ўсё на дзяржаўным роўні будзе названа сваімі імёнамі, бо „паўлічэнкі", „навумавы" і „лукашэнкі" не вечныя. А ідэалы Беларускай Народнай Рэспублікі будуць жыць, пакуль будзе жыць беларуская ідэя. А яна жыве, бо патрыятычнай моладзі становіцца ўсё больш, менавіта таму яе так жорстка пераследуюць сённяшнія антынацыянальныя сілы, якія шалеюць ад таго, што не могуць паставіць на калені беларусаў. І сапраўдны Дзень Волі ў Беларусь абавязкова прыйдзе.

06.04 — 12.04

(22.03. — 20.04.) Усе будуць табою заварожаны. Заваюеш нават сваіх працаўнікаў. 8-12.04. пазбягай крытыкі, каб не быць несправядлівым. Астудзі свой язык, каб не было вайны ў сям'і!

(21.04. — 21.05.) Да 9.04. будуць экстрэмальныя сітуацыі і вельмі цяжкія эмоцыі. Можаш стаць ахвярай маніпуляцыі або паддацца чару чалавека, які можа мець на цябе згубны ўплыў. Кіруйся інтуіцыяй, пазбягай радыкальных прыёмаў.

(22.05. — 22.06.) Будзеш упарты і заўзяты. Асцерагайся маньякальных думак, бо непатрэбна заблытаешся ў штосьці, што можа табе моцна зашкодзіць. З 8.04. пакажуцца твае схільнасць да спрэчак і гарачы язык. Зласлівасцю не здабудзеш прыхільнасці атачэння!

(22.06. — 23.07.) Напачатку спраўна дасі сабе рады ў кожнай сітуацыі, распазнаеш сябра і ворага. 7-12.04. будзеш цудоўны для сваіх падуладных, шэф табе таксама нічога не адмовіць. Не катуй сябе дыетамі, бо цяпер і так дарма!

(24.07. — 23.08.) 8-12.04. не паддайся маніі вялікасці, бо не выклічаш захаплення. Дзякуючы ўласным талентам можаш шмат дабіцца, станеш таксама маэстра ашчаднасці.

(24.08. — 23.09) Можа чакаць цябе часовае ахалоджанне ў партнёрскіх адносінах. Затое грошы не будуць для цябе ніякай праблемай! Выкапаеш іх нават з-пад зямлі! Паршывая авечка ў радні зноў табе дакучыць!

(24.09. — 23.10.) Магчымыя цяжкасці ў міжчалавечых адносінах, асабліва ў службовых. Хтосьці цябе схоча прымусіць да таго, на што зусім не маеш ахвоты. Новыя пачуцці могуць паказацца з зусім неспадзяванага боку.

(24.10. — 22.11.) Калі хочаш над усім трымаць кантроль, запавольвай тэмп. Ад некаторых планаў трэба будзе адмовіцца. Не будзеш упэўнены, ці тое, што лучыць цябе з блізкай асобай, гэта каханне ці сяброўства (да 9.04. праблемы ў пары ці з-за зайздрасці, ці здрады).

(23.11. — 22.12.) Маладзік Месяца (6.04) адкрые новы раздзел у тваім пачуццёвым жыцці. Калі ты адзін, азірніся — каханне бліжэй, чым можна спадзявацца. 10.04. пагражае табе зменлівасць настрояў; раз — эйфарыя, раз — чорныя думкі. Трымайся за сваю кішэню.

(23.12. — 20.01.) 10-12.04. — спрыяльны час для развою талентаў. Адкрыеш у сабе здольнасці, якіх па сабе нават і не спадзяваўся. На працы даб'ешся найбольш, ідучы да мэты малымі крокамі.

(21.01. — 19.02.) Цяжкавата дайсці да паразумення з каханай асобай, і ў кампанейскім плане падобныя скрыгаты. Да 9.4. не пераборшчвай са сваімі магчымасцямі, не вер у ніякія абяцанні. У пары больш жарсці і даверу. На працы будзеш ведаць, з кім трымацца.

(20.02. — 21.03.) 10.04. некаторыя мерапрыемствы могуць ускладніцца, так што на хвіліну прыйдзецца адплысці табе ў цень. З 11.04. удасца табе рэалізаваць усё, што захочаш. Наўкол цябе прыязныя людзі, у фінансах вельмі добрая кан'юнктура.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960

25 Сакавіка ў Вільні

Ніва
ПРА ГІСТОРЫЮ

Беларуская моладзь Сакольшчыны — IV

Ад міражоў культурнай працы ў Менску па салавецкія і карэльска-мурманскія папраўчыя працоўныя лагеры

6 верасня 1933 года, паміж чыгуначнымі станцыямі Негарэлае і Стоўбцы, адбыўся абмен палітвязнямі Польшчы і СССР. З польскай турмы быў звольнены лідэр Грамады Браніслаў Тарашкевіч. Узамен, саветы вызвалілі з салавецкай катаргі вядомага дзеяча, паэта і беларускага літаратара Францішка Аляхновіча.

Пра гэты жахлівы перыяд у жыцці Францішак Аляхновіч апавядае спакойна, час ад часу ягоны твар робіцца больш важным, дастойным, праблемы з памяццю ўзнікаюць толькі тады, калі трэба прыгадаць нейкія прозвішчы. Голас гучыць роўна, коратка, ясна і проста ён фармулюе сказы пра перыяд сямігадовай ссылкі. У гэтай аповесці няма пафасу, страчаных ілюзій, псіхічных паслядоўнасцей катаргі.

— Менавіта, так. 6-га гэтага месяца, — кажа спадар Аляхновіч, — нас абмянялі, 7-га я быў ужо ў родным горадзе Вільні. З Тарашкевічам бачыўся на мяжы. Мы сказалі сабе некалькі прывітальных слоў.

Мары пра беларускі тэатр

— У Савецкую Расію, — апавядае нам спадар Аляхновіч, — я паехаў у верасні 1926 года, на польскім замежным пашпарце і савецкай візе. Я хацеў наведаць сям'ю, родзічаў. Я прыехаў у Менск. Тады мне здавалася так — тут знайду для сябе большыя магчымасці і буду працаваць у карысць беларускай культуры. Цікавіў найперш мяне тэатр. У савецкай Беларусі працавалі тры дзяржаўныя тэатры, яны былі нядрэнна субсідзіраваны, адзін тэатр дзейнічаў у Менску, другі ў Віцебску, трэці працаваў як вандроўны тэатр. Я рашыў астацца і паспрабаваць уладкавацца на штат літаратурнага кіраўніка гэтых тэатраў. Якраз у гэтым часе мела адбыцца ўрачыстае адкрыццё тэатра ў Менску.

— Ці сапраўды, праца ў дзяржаўным бальшавіцкім тэатры, вам, беларускаму паэту і літаратару, паказалася рэальнай?

— Так. На сцэне пераважна ігралі арыгінальныя п'есы маладых беларускіх аўтараў. Вядома, такія творы былі прасякнуты рэвалюцыйным духам, яны былі згодны з кірункам, вызначаным партыйнай ідэалогіяй. Так і пісалі іх літаратары. Так ці інакш, яны адзначаліся знаёмасцю сцэнічнага майстэрства. П'есы карысталіся поспехам у менскай публікі. У Віцебску ставілі пераважна класіку, часта ў знакамітым перакладзе і апрацоўцы. Ігралі там Шэкспіра, „Вяселле Фігаро" Бамаршэ, „Эрас і Псіхе" Жулаўскага.

Францішак Аляхновіч (1883-1944)

Цягам 2008 года беларусы адзначаюць 90-гадавіну БНР. Гэты год лічыцца таксама годам Францішка Аляхновіча. 9 сакавіка мінула 125 гадоў з дня нараджэння беларускага драматурга, пісьменніка, „бацькі беларускага тэатра". Увазе чытача прапануем інтэрв'ю, якое Францішак Аляхновіч даў польскаму часопісу „Słowa" ў 1933 годзе, тры тыдні пасля вяртання з салавецкай ссылкі. Размову правёў другі славуты віленчук, польскі празаік і журналіст Юзаф Мацкевіч.

Натуральна, усе працавалі з думкай пра будучыню. За падборку рэпертуару адказваў дырэктар тэатра. Я не прыкмеціў нейкіх канфліктаў між аўтарамі і дырэкцыяй. Аўтары, яны ўсе вербаваліся з маладой гвардыі беларускай інтэлігенцыі. Іх гадавалі ў камуністычным рэжыме і яны самі добра разумелі чаго ад іх патрабуюць. Аднак верылі ў развіццё беларускага руху. Але не буду кранаць тут палітычных тэмаў.

„Участие в организации, действующей в направлении помощи международной буржуазии"

Так прагучаў абвінаваўчы акт, які я пачуў пасля амаль шасці тыдняў пабыўкі ў Менску. Я вяртаўся з Віцебска. У цягнік зайшлі функцыянеры ДПУ і арыштавалі мяне. Я быў адвезены ў Менск, там кінулі мяне ў падвалы ДПУ, што па вуліцы Савецкай, раней Захараўскай. Згаданы абвінаваўчы акт я пачуў пасля двух тыдняў. Мяне абвінавацілі ў тым, што з'яўляюся членам Беларускай Рады ў Вільні. Вядома, я не мог запярэчыць. Яны і самі добра ведалі хто я, раней далі ж мне савецкую візу.

— Ці доўга трымалі вас у Менску?

— У падвалах прасядзеў я да ліпеня. Камеры былі перапоўненыя. Зараз у Менску пабудавалі новую турму, вядомую паўсюдна як „Амерыканка". Чаму так завецца, не ведаю. Магчыма, пабудаваная яна на амерыканскі ўзор. Гэты будынак мае кшталт круглай вежы. Крымінальнікаў саджалі ў старую турму, у тую што пабудавалі да вайны. Я сядзеў у падвалах. Са мной былі беларускія сяляне, памешчыкі з памежжа, якіх вінавацілі ў шпіянажы ў карысць Польшчы, людзі, якія чакалі судовага працэсу, людзі, якіх падазравалі ў хабарніцтве, група беларускіх студэнтаў, якіх абвінавачвалі ў контррэвалюцыі. Я бачыў там процьму беларускай моладзі, якая ў пошуках лепшых палітычных умоў нелегальна перайшла польскую мяжу. Сядзелі ды чакалі завочнага прыгавору калегіі ДПУ. Такі прыгавор выдаваўся на аснове думкі судовага следчага, абскардзіць прысуд якога не было магчымасці. Я дачакаўся ў ліпені 1927 года. Мяне саслалі на 10 гадоў катаргі на Салавецкія астравы.

Мяч і „дрын"

Першае слова — гэта назоў вострава, другое — сістэмы, якая там панавала, — спадар Аляхновіч апавядае як па этапах яго даставілі да берага Белага мора. — Пакуль цягнік дацягнуўся на далёкую поўнач, была ўжо зіма. Дабрацца на Салавецкія астравы не было магчымасці, спынілася ўжо навігацыя. Тады перавезлі мяне на станцыю Сарокі, адтуль загадалі ісці пяшком 80 кіламетраў на востраў Мяч. Ён знаходзіцца 10 кіламетраў ад берага, вада там замярзае раней. Па лёдзе, — кажа, — я дабраўся на востраў, дзе было назначанае месца ссылкі. Там прабывала дзесьці 400 вязняў, у большасці крымінальнікаў. Палітвязні складалі адно чацвёртую частку. „Каэры", так называлі „контррэвалюцыянераў". Мы жылі ў бараках. — Спадар Аляхновіч раптоўна спыняе свой расказ і чамусьці задумоўваецца... — Так, чалавеку, які не прывык цяжка працаваць, не пад сілу было вытрымаць тыя ўмовы жыцця. Падымалі нас у тры гадзіны ночы, у тры з паловай лінейка і выдача прыладаў: пілаў, сякераў. У чатыры гналі ў лес на работу. У адзін бок трэба было ісці 10 кіламетраў, 10 кіламетраў назад. Працавалі цяжка. Ды трэба ведаць, што тады панавала сістэма „дрыну", гэта значыць сістэма палкі. Білі часта ды не толькі з-за невыкананай работы. Натуральна, калі нехта дабіўся пратэкцыі, або чым-колечы з'яднаў сабе вартавых, пазбягаў кары. Я, напрыклад, падарыў люльку. Падарыў яе вартавому. Былі яшчэ іншыя пакаранні. Раздзявалі да бялізны і праз назначаны час трымалі на марозе.

— Страшна.

— Так.

— А як вас кармілі?

— Мажліва. Гэта значыць... я паясню за момант... У 1927-28 гады нас кармілі два разы ў дзень. Раніцай сняданак: густы гарохавы або сачавічны суп, часам давалі густую грачаную кашу з алеем, густы суп з макаронай. Абед атрымоўвалі вечарам. Даставалі зноў міску густога супу з кавалачкам салёнага мяса. Хлеба давалі многа, нешта да кілаграма на душу. Так, кармілі зусім прыстойна.

Ён рукой пацёр лоб.

— Цяжка, цяжка было ўсё гэта перажыць. 30 мая 1928 года на першым параходзе, які прыплыў да вострава Мяч, мяне адправілі на Салаўкі.

Канец „дрыну", санацыя і голад

— Сваю ссылку я магу падзяліць на два этапы: першы, калі панаваў „дрын", значыць, калі білі, але зусім няблага кармілі і другі — гэта санацыя адносінаў фізічнага здзеку, паправа санітарнага стану і мізэрнае харчаванне. Відавочна, пра сітуацыю, якая запанавала на Салаўках у 1930 годзе даведаліся ў Маскве. Было сапраўды дрэнна там у нас, у бараках. Прыехала спецкамісія і высветліла ўсё на месцы. Многія з адміністрацыі патрапілі ў ссылку, многіх расстралялі. Між іншым, галоўнага каменданта лагера, якога засудзілі на 10 гадоў катаргі, іншы вышэйшы чыноўнік Мардвінаў быў пакараны за кантакты з хеўрай зладзеяў, яго засудзілі таксама на 10 гадоў, і г.д. Як гэта здарылася, раскажу.

Тыф ад гною ў апусцелых канюшнях

— Калі я патрапіў на Салаўкі, там было вельмі многа вязняў, недзе 12 тысяч. Прыбывалі ўсё новыя транспарты. Немагчы-

працяг ☞ II

9 770546 196000

І ☞працяг ма ўсіх іх было размясціць. Часткова жылі мы ў пасляманастырскіх будынках, часткова ў цэрквах або ў бараках, якія спецыяльна пабудавалі. Не было ўжо месца. Новапрыезджых пасялялі ў апусцелых канюшнях, проста на гноі, у вільгаці, у кашмарных умовах. Мы былі аблепленыя інсектамі. Дзе ні зірнеш, усюды блохі, клапы, вошы. Восенню 1929 года ўспыхнула эпідэмія сыпнога тыфу. Капалі мы тады ямы, прызначаныя для некалькіх соцень трупаў, і туды кідалі памерлых, а калі ямы былі поўныя, іх закідалі і капалі новыя.

— Многа памерла?

— Прыблізна, палова. Нешта 5-6 тысяч людзей. Адміністрацыя змагалася з эпідэміяй даступнымі сродкамі. Гэта значыць, аддзяляла ад сябе заражаныя баракі, не дазваляла на кантакты, на пераход з адной установы ў другую. Шпіталі, вядома, не маглі памесціць усіх хворых. Калі прыехала камісія, высветлілася, што тыф пачаўся ў канюшнях, дзе сялілі проста на гной.

— Пасля было лягчэй?

— Не было ўжо такога фізічнага здзеку ды палепшыліся санітарныя ўмовы...

— А маральны здзек?

Замест адказу спадар Аляхновіч дакладна распавядае пра Салаўкі.

„СЛОН", „СИКМИТА", „СЛАК" (СЛАГ)

Такія эвалюцыі скарачэнняў пераходзілі лагеры ссыльных у далёкай паўночнай Расіі. Найперш іх называлі „Соловецкие лагеря особого назначения". Пасля: „Соловецкие і Карело-мурманские исправительно-трудовые лагеря", канчаткова: „Соловецкия лагеря". Займаюць яны не толькі Салавецкія астравы, але і ўсю прастору паўночнай Расіі, населеную вязнямі. Суседнія астравы і суседні кантынент — бясконцыя лясы і бясконцыя пасёлкі ссыльных. Разбэшчанасць, голад, хваробы і мартыралогія. Вязні ўсіх нацый. Сярод іх ёсць усе: расіяне, беларусы, палякі, украінцы, якуты, чувашы, каўказцы, чарамісы, туркмены, і г.д. і г.д. Літоўцы, эстонцы, немцы, фіны. Сустрэнеце там вучоных, акцёраў, музыкантаў, жывапісцаў, літаратараў, юрыстаў, былых вайскоўцаў, адвакатаў, інжынераў, рабочых, сялян і яшчэ раз сялян, бо іх там найбольш. Найбольш „кулакоў", а сярод іх украінцаў.

Салавецкія астравы гэта іншы, закрыты свет. Ён маральна адарваны ад рэшты зямнога шару і самастойны ў гаспадарчым сэнсе. Згаданая разнавіднасць прафесій і спецыяльнасцей знакаміта спрыяе такой сістэме. Салаўкі маюць свае прадпрыемствы, майстэрні, сельскія гаспадаркі, фабрыкі, млыны, ганчарні, лесаперапрацоўчыя тартакі, тэатры, бібліятэкі, словам — тут усё апрача свабоды.

Новапрыбылы атрымоўвае апытальнік для запаўнення. Далей, т.зв. „дарадчыкі" накіроўваюць яго ў адпаведнай галіны барак. — Я асабіста — кажа спадар Аляхновіч, — на працягу сямі гадоў быў дрывасекам, вартавым, акцёрам, канцэлярыстам, суфлёрам, жывапісцам.

Сны пра ўцёкі

Праўдападобна ўсім на Салаўках сняцца сны. Уцячы з Салавецкіх астравоў немагчыма. З кантынента лягчэй. Толькі адзінкам, якім спрыяе шчаслівая выпадковасць, часам пашанцуе збегчы. Найперш трэба мець адзежу і грошы. Ісці простай дарогай вельмі рызыкоўна. Дарог там мала, ды мясцовыя ловяць уцекачоў і здаюць у рукі вартаўнікоў; за кожнага ссыльнога карэл дастае два пуды белай мукі. Прабачце, даставаў у часы НЭПа. Сёння два пуды белай мукі гэта вялікія грошы, удады ўжо не могуць так шчодра абдароўваць тубыльцаў. Ці лепш уцякаць напрасткі, лесам? Не ведаю, гэты варыянт здаецца мне зусім немагчымым. Летам непраходныя балоты, зімой — снягі. Аднак людзі, даведзеныя да крайняга адчаю, здольны рашыцца на ўсё. Я чуў, што ў 1928 годзе расстралялі 70 чалавек, якія планавалі бунт, хацелі захапіць адзін карабель і ўцячы з вострава. Ведаю што іх расстралялі, аднак ці яны сапраўды планавалі паўстанне, гэтага вам не скажу. Найгорш выглядае справа з адзежай. Яна старая, часта напамінае лахманы. Дзякуючы пратэкцыі можна прыдбаць лепшую вопратку, часам новую. Хоць рэдка такое каму-небудзь удаецца. Вопратка наогул цёплая. Калі я туды трапіў, мне далі валёнкі, ватавыя нагавіцы і курткі.

Памада для губ і алоўкі для броваў

Спачатку трэба спазнаць пекла зняволеных людзей, іх дэмаралізацыю і голад, каб поўнасцю зразумець прычыны прастытуцыі, якая шырыцца на Салаўках. Колькасць жанчын на Салаўках састаўляе 17-20 працэнтаў. Сярод іх ёсць сівыя, старыя, гарбатыя, фізічна знішчаныя кабеты. Ім можна верыць, яны тут самыя чэсныя. Апошнія ў хуткім часе дэмаралізуюцца. Жанчыны і мужчыны, прынцыпова, раздзеленыя. Жанчыны жывуць асобна, мужчыны асобна. Сустракаюцца аднак у час працы, у канцылярыях, і г.д. Жанчыны мыюць і прыбіраюць ва ўстановах, у якіх працуюць мужчыны. Хоць бліжэйшыя кантакты сурова забаронены, аднак прастытуцыя пашыраецца ў маланкавых тэмпах.

— Вы называеце прастытуцыяй?..

— Амаль выключна за грошы. Прымушаюць умовы жыцця, найперш голад. Голад там паўсюдны, з ім немагчыма змагацца. Я чуў, што 80 працэнтаў жанчын на Салаўках хворыя венерычнымі хваробамі. Існуюць там кааператывы, у якіх кожны можа купіць вызначаную для сваёй катэгорыі колькасць тавару. Прыкладова цукар, гарбату, селядцы. Аднак самым вялікім збытам карыстаюцца памады, зубны парашок, алоўкі для маляванння броваў. Купляюць іх жанчыны... каб мець лепшыя харчы.

— А ці бываюць адначасова сярод ссыльных сужонствы?

— Вядома, даволі часта. Такія сужонствы, у выпадку, калі „яна" маладая, хутка разыходзяцца. Інакш не бывае. Кожны адрэзак вострава, кожны лапік зямлі прасякнутыя там маральнай гніллю. Словам — адна роспач і нэндза чалавечага існавання.

Не ямы, а скрынкі для трупаў

— Прабачце, вы сказалі, што свой побыт можаце падзяліць на два этапы, ці гэта абазначае што зараз там крыху лягчэй.

— Зараз смяротнасць больш-менш натуральная. Па прычыне клімату і дрэнных харчоў вязні хварэюць цынгой, туберкулёзам, гэтая хвароба асабліва шырыцца сярод моладзі, далей скулы, гэта гнойныя нарывы, якія пакрываюць цела з-за мізэрнай і аднастайнай яды. На сённяшні дзень сітуацыя выглядае так: у пяць гадзін раніцы, з бальніцы выязджае спецыяльная скрынка, у якой знаходзіцца ад 8 да 10 трупаў. Побач, у белых халатах і чорных гумовых рукавічках, ступаюць санітары. Змесціва скрынкі яны выкідаюць у яму, закопваюць, скрынку дастаўляюць назад у бальніцу.

— Лягчэй..

— Карміць сталі горш чым раней. Чаму так? Думаю, што ў Расіі таксама пануе голад. Апошнім часам, з самага рання, нам давалі салёны суп на соленай рыбе, з маленькай дабаўкай прасяной кашы. Пад вечар зноў солены суп і адна рыба на асобу. Хлеб выдзялялі ў залежнасці ад катэгорыі; тыя, што мелі цяжкую фізічную працу, атрымоўвалі 800 грам, тыя, што працвалі лягчэй — 550 грам, канцэлістам давалі 400 грам, а інвалідам — 300. Цукар два разы ў месяц, хапіла каб пасаладзіць дзве шклянкі гарбаты. Вось і ўсё. Карміць сталі горш з 1930 года. Расказвалі мне новапрыбылыя, што ў Расіі пануе голад, асабліва на Украіне.

— А рэпрэсіі, праследы?

„ИСО"

— Яны найбольш дакучаюць. Існуе такая ўстанова „ИСО" — Инспекционно-следственное отделение. У іх руках усе ніці шпіёнскай сеткі, яны кіруюць цэлай разведачна-правакатарскай сістэмай. Трэба ведаць, што на Салаўках няма цалкам вольных людзей. Нават адміністрацыя, нават камендант лагера, яны хоць афіцыйна вольныя людзі, але іх накіравалі сюды з глыбіні Расіі за нейкую кару. Брыгадзіры і большасць стражы выбіраюцца проста з вязняў. Яны найгоршыя. Каб падлізацца сваім начальнікам, гатовы выслугоўвацца да немагчымага. У кожнай камеры, бараку, пакоі — усюды шпіёны. Іх мэта — сачыць за добранадзейнасцю думак, пісаць характарыстыкі і пра кожны выпадак інфармаваць начальства. Мы жывём у пастаянным страху, увесь час трэба сцерагчыся і зважаць на свае словы.

А як там крадуць!

Бадай найбольшай бядой Салавецкіх астравоў з'яўляюцца пакражы. Крадуць усе і ўсюды. Крадуць у камеры, у бараках, чысцяць кішэні, крадуць вечарам і ў белы дзень, на дарозе, на прыступках у канцылярыю, на полі, у лесе. Нападаюць у некалькі чалавек, вырываюць, прыкладова, пасылку, затрымоўваюць яе, раскрадаюць. Гэтая з'ява падыктаваная эканамічнымі ўмовамі тамтэйшага жыцця, падобна як прастытуцыя. Адміністрацыя не супрацьдзейнічае. Я ўжо гаварыў, што чыноўнікі часта прымыкаюць вока на зладзеяў, узамен тыя дзеляцца з імі здабычай. Вязень не ведае хвіліны спакою. У кожны момант яго могуць абакрасці, пазбавіць маёмасці.

Багатая бібліятэка на Салаўках

Спадар Аляхновіч апавядае, што на Салаўках існуе вялікая і добра скамплектаваная бібліятэка, у якой знойдзем белетрыстыку і навуковыя творы.

— А ці на практыцы, у такіх складаных умовах, сярод цяжкай фізічнай працы, голаду і холаду, ёсць магчымасць пакарыстацца гэтай бібліятэкай? — пытаю.

Людзі заўсёды знойдуць час на чытанне кніжак, асабліва калі жывеш у такіх умовах, дзе няма іншай пацехі. Мы мелі кніжкі па ўсіх галінах ведаў. На рускай, польскай, французскай мовах, нават на італьянскай, нямецкай, на скандынаўскіх мовах, — мы мелі нават тэатр.

— Тэатр, цікава...

— Я ўжо гаварыў як вялікую разнавіднасць прафесій змяшчае ў сабе салавецкая ссылка. 1927-28 гады гэта час сапраўднага росквіту тэатра на Салаўках. Сярод вязняў знаходзіліся многія выдатныя акцёры, спевакі, музыканты. Мы стварылі першаякасную трупу. Наш тэатр быў сапраўдным тэатрам. Ва ўсіх аддзелах працавалі спецыялісты: афарміцелі, памочнікі рэжысёра, электратэхнікі, цырульнікі, інжынеры. Іх там столькі — Божа ты мой!.. На сцэне выступалі жанчыны і мужчыны. Мы ставілі чатыры спектаклі ў тыдзень. Два платныя і два дармовыя, апошнія па загадзе адміністрацыі. У час дармовых пастановак мужчын і жанчын саджалі асобна. На платны спекталь кожны мог купіць білет і сесці дзе хацеў. На апошнія сеансы прынцыпова прыходзіла многа гледачоў і кожны, хто купіў білет, хацеў мець пры сабе нейкую абранніцу сэрца. Часта тэатральныя сеансы мелі характар калектыўных любоўных спатканняў, якія складана было наладзіць у нармальных умовах.

Вегеракша — Дарога Чараўніц

Верасень 1932 года заспеў мяне яшчэ на Салаўках. Аднак у гэтым месяцы я выстараўся, каб перавялі мяне ў горад Кем на кантыненце, некалькі кіламетраў ад Белага мора, ля аднайменай рэчкі. Непадалёк горада знаходзіцца лагер для ссыльных, абведзены калючым дротам, вядомы таксама як Вегеракша, што па-карэльску значыць „Дарога Чараўніц". У ім тры тысячы вязняў. Там працаваў турэмны тэатр, які даваў спектаклі таксама для вольных жыхароў горада. Ён выступаў у тамтэйшых клубах, публічных залах і г.д. Менавіта таму я пастараўся, каб мяне перавялі.

Пасля няцэлага года, нечакана, 13 ліпеня 1933 г. мяне паклікалі ў канцылярыю і загадалі рыхтавацца ў дарогу, але пакуль што да чаго мяне пасадзілі ў ізалятар. У ізалятар саджаюць людзей, якія ўчынілі вялікае злачынства або забойства. На другі дзень мяне пасадзілі ў цягнік і адправілі ў Маскву.

З Бутырак на волю

Я папаў у славутую турму на Бутырках. Сядзеў там і нічога не ведаў аж да 4 верасня. Толькі калі пасля сямі тыдняў мне далі чыстую бялізну, завялі ў лазню, астрыглі — у галаве засвяціўся праменьчык надзеі, што ў маім жыцці нешта зменіцца ў добры бок. Сапраўды, у гэты дзень мяне паінфармавалі, што буду абменены. Мяне перавезлі на вуліцу Лубянка н-р 2 у цэнтр ДПУ, дзе быў я прадстаўлены працаў- ☞

БЕЛАРУСЬ — вечная ты!!!

90 год абвяшчэння БНР адзначылі ў Вільні

Алесь АДАМКОВІЧ, Вільня

— Скажыце, гэта беларусы?
— Так
— То вельмі прыгожа!!!
(З дыялогу з невядомым літоўцам, які быў уражаны хараством лунаючых бел-чырвона-белых сцягоў, калі шыхт маладых беларусаў 25 сакавіка з дому настаўніка рушыў у Базыльянскія муры)

25 сакавіка

Менавіта з гэтага дыялогу хацелася б распачаць расповед аб святкаванні Дня Волі ў Вільні. Так, гэта было заканчэннем мерапрыемстваў, але гэты дыялог пакінуў у душы найбольшае ўражанне. Невядомы літовец захапляўся прыгажосцю беларускіх сцягоў, у той час, калі гэтыя сімвалы ў Беларусі зняважаныя і забароненыя. А з імі і самі героі, тыя, што тварылі Беларусь. Але яна так і надалей пачынае заставацца нейкай міфічнай істотай, так і не стаўшай быццём.

25 Сакавік 1918 года стаў самым значным і самым балючым у найноўшай гісторыі беларускай зямлі. І бег часу нам сёння адмераў 90! Час, каб прааналізаваць і ўбачыць тое, што маем.

Так, ідэалы не ажыццявіліся. Беларусь так і не стала незалежнай дзяржавай, беларуская мова не гучыць у ёй, яе насельнікам не вядомая гісторыя свае зямлі...

Але...

На палітычнай карце сёння ёсць Беларусь. Пра яе гавораць, аб ёй ведаюць. Гэта сталася перамогай 25 сакавіка, а значыць, тое, што адбылося тады, дало ўсходы. Праз знявагу, праз забыццё, хлусню і няўдзячнасць Беларусь нараджаецца да вольнага сусвету.

25 сакавіка — гэта яшчэ і дата яднання беларусаў у свеце. Так, лёс іх такі, што падзелены на каталіко ў і праваслаўных, на няверуючых і праваслаўных атэістаў. А вось гэты сакавік іх з'яднаў у нацыю, даў магчымасць адчуць сябе народам.

90 год. А тыя дні яшчэ жывыя. 90! Гэтая лічба гучала ва ўсім свеце. Беларусь жыве!

Гэты дзень аб'яднаў і беларусаў Вільні, якія, нягледзячы на шматлікія супярэчнасці і плыні, вырашылі аб'яднацца і супольна адзначыць Дзень Волі, а тым самым засведчыць, што Беларусь жыве.

І самае таму вялікае пацвярджэнне, што на свяце было шмат моладзі: маладое пакаленне захварэла і жыве Беларуссю.

Урачыстае свята распачалося з віленскіх могілак Росы, дзе ад імя ўсіх беларусаў быў ускладзены вянок „Стваральнікам Беларускай Незалежнасьці — ад удзячных нашчадкаў" да помніка братам Івану і Антону Луцкевічам. Менавіта дзякуючы віленскім беларусам і была абвешчана БНР, бо тады яны адыгралі рашаючую ролю.



Прэзідэнт Валдас Адамкус павіншаваў беларусаў з іх нацыянальным святам

У доме настаўніка, у вялікай зале адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 90-годдзю абвяшчэння БНР (гэта была другая частка праграмы).

Важна адзначыць, што зала напоўнілася людзьмі, што сярод іх было вельмі шмат маладых...

Як і ў той час, гучаў гімн „Мы выйдзем шчыльнымі радамі", які абвесціў аб пачатку другой часткі мерапрыемства.

Ад імя прэзідэнта БНР Івонкі Сурвілы віншаванне зачытаў сябра рады БНР, старшыня Таварыства беларускай культуры ў Літве Хведар Нюнька. І гэтым было засведчана, што беларусы з'яднаныя духова, што БНР жыве.

І думаю, у кожнага хвалявалася сэрца, калі чалец літоўскага Сойму Ёнас Чакуоліс (літовец) прамовіў некалькі словаў віншавання па-беларуску. І ў прыватнасці ён зазначыў, што беларусы і літоўцы самыя блізкія народы, маюць агульную гісторыю, падобную сімволіку і ўвесь час былі разам.

З віншавальным словам звярнуўся і Вацлаў Станкевіч, чалец літоўскага Сойму, адзін з вядомых палітыкаў Літвы, беларус паводле ўсведамлення, нашчадак славутага роду Станкевічаў.

Ад імя дэпартамента нацыянальных меншасцей віншаванне зачытаў Валянцін Стэх.

Аб гісторыі БНР, аб яе значэнні і лёсе даклад зачытаў прафесар Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта Алесь Смалянчук. У сваім дакладзе ён кораценька акрэсліў уласны погляд на праблему БНР, падняў пытанні аб тым, што мы мелі і чаму атрымалася тое, што атрымалася.

Далей была святочная частка праграмы. З Беларусі павіншаваць віленчукоў, а таксама раздзяліць з імі радасць свята, прыехалі барды Вальжына Цярэшчанка і Зміцер Бартосік. Было прыемна чуць жывы беларускі голас.

Радасць беларусаў раздзялілі і браты ўкраінцы, якія таксама прыехалі са святочным канцэртам, каб павіншаваць сваіх суродзічаў з самым вялікім святам. Беларусы і ўкраінцы маюць шмат супольнага, роднасныя мовы, і слова Воля аднолькава гучыць як для ўкраінцаў, так і для беларусаў. І ў зале загучалі гукі Украіны.

І ўсе разам радаваліся, што Беларусь жыве, што яна ёсць. І як бы там ворагі не хацелі б яе знішчыць, як бы не хацелі яе зрусіфікаваць, яна ёсць. І не падуладнаю часу, забыццю, знішчэнню.

А пасля калона рушыла ў Святая Святых для беларусаў — у Базыльянскія муры. Там, у грэка-каталіцкай царкве Святой Тройцы адбылося набажэнства за Беларусь, якое адправіў святар Ян Даўкшыс.

І гучала гэтая святая мова, услаўляючы свайго Творцу, аддаючу яму падзяку, за тое, што стварыў такую велічную мову і Беларусь.

Яна сёння прайшла крыжовым шляхам, як і Той, да каго ўзносіліся песні падзякі і словы-просьбы аб вольнасць беларускай зямлі.

26 сакавіка

26 сакавіка ў Сойме Літоўскай Рэспублікі адбылася акадэмія, прысвечаная 90 угодкам абвяшчэння БНР, у якой прынялі ўдзел прэзідэнт Літоўскай Рэспублікі Валдас Адамкус, дэпутаты Літоўскага Сойму, прадстаўнікі ўрадавых структур і беларускія актывісты. Пад бел-чырвона-белым сцягам прагучаў гімн „Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Пасля прэзідэнт Валдас Адамкус павіншаваў беларусаў з іх нацыянальным святам, затым выступалі відныя палітыкі і вучоныя Літвы, а таксама беларусы, актывісты з Бацькаўшчыны і Вільні. Сустрэча шырока асвятлялася ў сродках масавай інфармацыі Літвы.

* * *

Беларусь, Ты вечная. І Твае Святыя Заступнікі ў небе з Табой. На Боскай Літургіі 25 сакавіка святар прамаўляў: „Хрыстос Уваскрос!". А з імі гучалі і словы надзеі: „І Беларусь уваскрэсне!".

ніку польскага пасольства ў Маскве. Ён пацвердзіў інфармацыю пра абмен і сказаў, што заўтра паеду ў Польшчу.

5 верасня, у адкрытым аўто, у суправаджэнні аднаго афіцэра і салдата, вуліцамі Масквы мяне даставілі на вакзал і ў асобным вагоне цягніка я быў давезены на польскую граніцу. 6 верасня наладзілі абмен, 7 верасня я ўжо быў у Вільні.

Спадар Аляхновіч глыбока ўздыхнуў, відавочна расказ пра сваё жыццё стаміў яго.

* * *

— Ці можаце мне сказаць, як сёння бачыцце будучыню беларускага руху ў межах СССР?

— Цяжка мне пра гэта гаварыць. Думаю, што ў саветах паступова і сістэматычна наступае ліквідацыя бларускага руху. Я сам быў гэтаму сведкам і спазнаў на сабе. У Менску адбываюцца паўсюдныя арышты беларускай інтэлігенцыі. У 1931 годзе там зрабілі вялікую „чыстку" і праўдападобна зараз зноў паўтарылі. Цяжка мне пра гэта гаварыць. Сем гадоў я быў адарваны ад жыцця. Жыў сярод пекла, голаду, эпідэмій, хвароб і іншых атрыбутаў катаргі. Здаецца, аднак, што няма ніякай будучыні для беларускага руху ў кантакце з сістэмай, якая зараз пануе ў Расіі.

— Ці можна спытаць у вас пра планы на найбліжэйшую будучыню?

— Буду працаваць на ніве беларускай культуры, літаратуры і публіцыстыкі, буду асцерагаць перад ілюзіяй сацыялістычнага будаўніцтва ўсіх тых, хто імкнецца знайсці там айчыну. Як беларускія сяляне, якіх я сустрэў у катаргах Расіі або віленскія рабочыя, якіх я пабачыў на Бутырках. Над імі здзекаваліся, іх няволілі. Яны самі з пагардай адзываліся пра людзей, якія іх агітавалі, намаўлялі. Я лічу сваім абавязкам асцерагаць масы, каб яны не перасякалі савецкую мяжу, бо там знойдуць голад і турму.

Гутарыў Юзэф Мацкевіч
Пераклад Г. Кандрацюк

Słowo, 1933, nr 264 (27 wrzesień), Wilno

На паштоўках — беларуская моладзь Сакольшчыны

Сяргей ЧЫГРЫН

Гродзенскія краязнаўцы і гісторыкі падрыхтавалі і выдалі набор з 13 паштовак пад назовам — „Горадня — другая сталіца БНР". Гэтае выданне прымеркавана да 90-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі.

Дзве паштоўкі з гэтай серыі маюць непасрэднае дачыненне да гісторыі Сакольшчыны. А справа ў тым, што восеньскім вечарам 1909 года ў цеснай кватэры ксяндза Францішка Грынкевіча ў Бернардыйскім касцёле ў Гродне быў створаны Гарадзенскі гурток беларускай моладзі.

На адным вялікім групавым фотаздымку можна пазнаць ксяндза Францішка Грынкевіча (1884-1933), які паходзіў з вёскі Новы Двор Сакольскага павета. У свой час ён скончыў Віленскую духоўную семінарыю і Пецярбургскую духоўную акадэмію.

Ёсць на здымку і Адам Бычкоўскі (1889-1937) — першы старшыня Гарадзенскага гуртка беларускай моладзі. Родам ён быў з маёнтка Талочкі Сакольскага павета. У гуртку Адам выступаў з рэфератамі, пісаў п'ескі, ставіў спектаклі, чытаў са сцэны вершы. Ён быў даволі адукаваным хлопцам, скончыў у свой час юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Сярод беларускай моладзі Адам Бычкоўскі карыстаўся вельмі вялікай павагай і аўтарытэтам. Пэўны час наш зямляк працаваў суддзёй у Саколцы, а ў 1930-х гадах — адвакатам у Варшаве. Там ён прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі асветнага таварыства беларусаў. Сам распрацаваў статут таварыства і стараўся яго зацвердзіць праз камісарыят ураду Варшавы, Міністэрства ўнутраных спраў. Ён даваў усім беларусам Заходняй Беларусі бясплатныя юрыдычныя кансультацыі і парады. Але жыццё Адама Бычкоўскага, на жаль, рана абарвалася. Гэта здарылася, як піша Аляксей Пяткевіч у сваёй кнізе „Старонкі спадчыны" (Мінск 2006) у ягоным службовым кабінеце, дзе ён памёр ад інфаркту.

Сярод беларусаў Сакольшчыны магчыма на гэтым калектыўным здымку ёсць Язэп Лявіцкі, Вінцук Семяновіч, Фэлька Лабенец, Антон Спявак, Станіслава і Эдзюк Кунды, Пранук Эйсмант ды іншыя, на дзейнасці якіх трымаўся Гарадзенскі гурток беларускай моладзі.

Язэп Лявіцкі (1893-1916) паходзіў з Сухаволі (па іншых звестках з хутара Горны Хлеўск) Сакольскага павета. Скончыў Гарадзенскую гімназію, вучыўся ў Пецярбургскай медыцынскай акадэміі. У гуртку беларускай моладзі Язэп Лявіцкі быў артыстам, мастаком дэкарацый, спяваў у хоры. Друкаваўся ў гродзенскім часопісе „Педагагічная справа" пад псеўданімам Юрка Снапко. Выдаваў у 1913 годзе на шапірографе літаратурны альманах „Колас беларускай нівы". Загінуў падчас Першай сусветнай вайны.

Вінцук Семяновіч нарадзіўся ў Новым Двары. У Гарадзенскім гуртку выступаў як акцёр. Загінуў у гады Другой сусветнай вайны.

У вайну загінуў Антон Спявак, у Расіі ў 1918 годзе прапаў Фэлька Лабенец. Трагічным быў лёс і многіх іншых сяброў Гарадзенскага гуртка беларускай моладзі.

На другім здымку з 6 асобаў можна пазнаць у першым радзе (злева направа) Зоську Верас, Марысю Бобрык і Юзю Грынкевічанку. За імі стаяць (злева направа) Язэп Раманскі, Адольф Зянюк і нехта Янік. Актыўнасцю ў гуртку найбольш вылучаліся Адольф Зянюк і Зоська Верас.

Адольф Зянюк (1894(?) — 1938) паходзіў з Сухаволі Сакольскага павета. Вучыўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта, скончыў адну з ваенных вучэльняў у Кіеве. У гуртку актыўна ўдзельнічаў у спектаклях, пісаў апавяданні. З 1925 года рэдагаваў часопіс „Студэнцкая думка" ў Вільні, дзе і памёр.

Зоська Верас (1892-1991) нарадзілася на Украіне. Бацька быў родам з Гродна, а маці — з маёнтку Крыштапарова Сакольскага павета. У 1909 годзе Зоська Верас паступіла ў прыватную жаночую гімназію Баркоўскай у Гродне, дзе прычынілася да арганізацыі і дзейнасці Гарадзенскага гуртка беларускай моладзі, які ставіў сваёй мэтай развіццё нацыянальна-патрыятычнай самасвядомасці народных мас. Зоська Верас збірала кнігі для бібліятэкі гуртка, дзеля чаго наладзіла сувязі з віленскай беларускай кнігарняй, рэдакцыяй „Нашай нівы", суполкай „Загляне сонца і ў наша аконца". Іграла ў спектаклях, перакладала з польскай мовы аднаактоўкі для драматычнага гуртка, удзельнічала ў падрыхтоўцы і выданні альманаха гурткоўцаў „Колас беларускай нівы".

Беларускі музей у Нью-Йорку

Юбілейная выстава „Беларускі жывапіс і графіка"

23 сакавіка 2008 г., у 90 гадавіну абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларускі музей у Нью-Йорку адчыніў юбілейную выставу беларускага жывапісу і графікі. Роўна год таму быў створаны Беларускі музей. За гэты час было праведзена пяць мастацкіх выставаў з удзелам знакамітых беларускіх мастакоў.

У выставе паказаны працы Аляксея Марачкіна, Сяргея Цімохава, Яўгена Шатохіна, Міколы Купавы, Уладзіміра Новака, Алеся Шатэрніка, Генадзя Драздова, Рыгора Батальёнка, Анатоля Бараноўскага, Аляксандра Грыгор'ева, Міхаіла Карпука, Зміцера Эпштэйна, Юліі Шатэрнік, Канстанціна Селіханава.

Усяго былі прадстаўлены 32 працы, выкананыя ў розных стылях — ад імпрэсіянізму з рэалізмам да абстракцыі і кубізму.

Жыве Беларусь!

www.belmuseum.org

Нью-Йорк: дэманстрацыя, выстава і дыктоўка беларусаў

У нядзелю, 23 сакавіка, беларуская моладзь у Нью-Йорку правяла дэманстрацыю каля будынка штаб-кватэры ААН. Пасля адбыліся святочныя імпрэзы да 90-х угодкаў БНР. У Беларускім музеі ў Нью-Йорку адкрылася новая мастацкая выстава, амерыканскія беларусы ўзялі таксама ўдзел у нацыянальнай дыктоўцы.

У дэманстрацыі ўзялі удзел каля 15 чалавек. Удзельнікі трымалі бел-чырвона-белыя сцягі і плакаты ў падтрымку Маладога фронту, а таксама плакаты з надпісамі „Свабоду палітвязням!", „Расея, рукі прэч ад Беларусі!", „Няма месца для Расеі ў G8!", „Скажы «не» саюзу двух дыктатараў — Пуціна і Лукашэнкі!".

Пасля святочнай дэманстрацыі, прысвечанай 90-годдзю БНР, святочныя імпрэзы адбыліся ў грамадскай зале Кафедральнага сабора св. Кірылы Тураўскага ў Брукліне, а ў Беларускім музеі, які месціцца ў тым жа будынку, адкрылася новая мастацкая выстава.

— На выставе былі 32 новыя працы беларускіх мастакоў, у тым ліку Аляксея Марачкіна, Алеся Шатэрніка, Генадзя Драздова, Уладзіміра Новака, Аляксандра Грыгор'ева, Рыгора Батальёнка, Міколы Купавы, Юліі Шатэрнік, — расказаў Алесь Сідарэнка, сябра Беларускага моладзевага руху Амерыкі. — Мы таксама глядзелі кінастужку рэжысёра Антося Цялежнікава „Беларускі пасляваенны антысавецкі супраціў: 1944-1959 гадоў". Гэты фільм па-беларуску, і так прыемна чуць родную мову тут, у Амерыцы. Мы таксама глядзелі відэазапіс выступу Данчыка ў Мінску, слухалі яго песні і яго словы аб беларускай незалежнасці. Прыемна, што мы тут — усе разам, не губляем сувязей з беларусамі. Са святам усіх! Жыве Беларусь!

Беларусы Амерыкі, якія прыйшлі на святкаванне, таксама напісалі нацыянальную дыктоўку.

Апрача гэтага, нью-йоркскія беларусы сабралі ахвяраванні на ўсталяванне мемарыяльнай дошкі на былой амбасадзе БНР у Таліне і заклікалі ўсіх беларусаў далучыцца да збору грошай, каб гэтая табліца атрымалася сапраўды народным памятным знакам.

Тацяна ПОКЛАД
Радыё Свабода
www.belmov.org